

ЯК МЕДЫЯТАРЫ ДАПАМАГАЮЦЬ «ЦЯЖКІМ» ПАДЛЕТКАМ

Сямейная газета

СТВАРАЕМ ПЛАН ПАСАДАК НА ЎЧАСТКУ 16



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

23 САКАВІКА 2023 г. ЧАЦВЕР № 55 (29935)

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «КАЛІ ЗАБУДЗЕМ ДАРОГУ Ў ХАТЫНЬ, УСЁ ПАЎТОРЫЦЦА»



## Пра што Прэзідэнт гаварыў у абноўленым мемарыяльным комплексе «Хатынь» у 80-ю гадавіну трагедыі

**Маштабная рэканструкцыя мемарыяла, які стаў сімвалам усіх спаленых нацыстамі беларускіх вёсак, завяршылася. За рэкордныя дзесяць месяцаў — па рашэнні кіраўніка дзяржавы рэстаўрацыйныя работы ў Хатыні былі аб'яўлены Усебеларускай маладзёжнай будоўляй — адрамантаваны элементы скульптуры «Няскораны чалавек», праведзена рэстаўрацыя гранітных пліт дарогі, элементаў мемарыялаў «Апошні шлях», «Дах адрыны», «Вянок памяці», «Магілкі вёсак» і «Дрэвы жыцця», добраўпарадкавана прылеглая тэрыторыя.**

У Хатыні з'явіўся храм — цяпер кожны наведвальнік гэтага трагічнага месца можа сюды зайсці і памаліцца, паставіць свечку не толькі за тых, хто 22 сакавіка 1943 года пакутлівай смерцю загінуў у той адрыне, а за ўсіх жыхароў Беларусі — бязвінна забітых у сваіх населеных пунктах. А каб яшчэ раз усвядоміць увесь цяжар трагедыі, які ў гады Вялікай Айчыннай вайны панёс беларускі народ, а магчыма, упершыню даведацца аб тым жаху, што ўчынілі на нашай зямлі фашысты, варта наведаць музей, створаны на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу. Шэсць зал паэтапна пазнаёмяць з гісторыяй буйных ваенных канфліктаў, трагедыяй мірнага насельніцтва ў іх.

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з экспазіцыяй і першым пакінуў запіс у кнізе ганаровых гасцей музея. У памяць аб ахвярах генацыду Прэзідэнт усклаў вянок і запаліў свечку ў храме, размешчаным на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу. У памятных мерапрыемствах з нагоды трагедыі ў Хатыні ўдзельнічалі і яго сыны.

### «МЫ НЕ ЗАБЫЛІСЯ»

Звяртаючыся да суайчыннікаў і ўсіх прысутных у гэтым сімвалічным месцы, падчас мітынгу-рэквіема Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што памяць і абавязак прывялі нас 22 сакавіка ў Хатынь, «у вёску, якой больш няма і ніколі не будзе на геаграфічнай карце Беларусі». Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што роўна 80 гадоў таму тут спыніўся час: «Спынілася гісторыя роду беларускіх сем'яў, якія мірна жылі на сваёй зямлі, абарваліся 149 жыццяў — старых, жанчын і дзяцей, у тым ліку тых, якія не паспелі нарадзіцца. Гэтая трагедыя, як і тысячы такіх жа жахлівых злачынстваў, здзейсненых у гады Вялікай Айчыннай вайны, навечна выбіта ў камені і ў сэрцы беларускага народа. У сэрцы народа-пераможцы — моцнага і велікадушнага, які ўмее дараваць».

Прэзідэнт звярнуў увагу, што да гэтага часу мы стараліся не абцяжарваць пачуццём віны дзяцей і ўнукаў катаў, якія прыйшлі на нашу зямлю, каб канчаткова вырашыць пытанне з усходнімі славянамі. «Мы раней не падкрэслівалі, што большасць краін Заходняй Еўропы ўстала пад сцягі гітлераўскай Германіі, і сусветны капітал аплаціў гэты паход, — канстатаваў беларускі лідар. — Яны супраць нас сёння ўводзяць санкцыі, развязалі эканамічную, інфармацыйную вайну. Але мы не забыліся і нашчадкам карнікаў таксама нагадаем, як у далёкім 1941-м беларуская зямля ператварылася ў адзін вялікі лагер смерці. Як людзей спальвалі, душылі танкамі, тапілі, расстрэльвалі прамой наводкай з цяжкіх гармат. Як закопвалі дзяцей жыўцом, эканомячы кулі, і распылялі над нашымі гарадамі і сёламі ядавітыя рэчывы».



Фота БелТА.

«Сёння мы аплакваем жыхароў адзінаццаці тысяч нашых вёсак, пасёлкаў і хутароў, спаленых часткова або поўнасцю, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Мы аплакваем усіх нявінных ахвяр нацызму, усіх герояў, якія не вярнуліся з той вайны. Гэта 50 мільёнаў жыхароў планеты. Большая частка — савецкія людзі. Вечная ім памяць».

СТАР. 2

## КОРАТКА

- НАН аб'явіла конкурс творчых работ, прысвечаны Году міру і стваральнай працы.
- **Беларускі даклад аб выкананні Канвенцыі аб ядзернай бяспецы прадставілі ў МАГАТЭ.**
- Сацыяльны раўнд «Канікулы ў бяспецы» праходзіць у Мінску з 22 сакавіка да 7 красавіка.
- **У Беларусі сфарміраваны рэйтынг інфраструктурных праектаў.**
- Мікалай Шарстнёў выбраны новым старшынёй Беларускай федэрацыі футбола.



# МАСТАЦТВА ЛЮБОВІ ДА КНІГІ

**У сталіцы ўчора адкрылася XXX Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш, якая сёлета сабрала прадстаўнікоў кніжнай індустрыі з дзясяткаў краін свету. На працягу пяці дзён кніжны форум будзе пляцоўкай для прэзентацый выдавецкіх дасягненняў, сустрэч з прадстаўнікамі творчых, інтэлектуальных колаў, для якіх кніга і яе слова былі і застаюцца каштоўнасцю.**

Падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця прывітальнае слова ад кіраўніка краіны Аляксандра Лукашэнкі агучыў **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ.** «Праслаўляючы шматвекавыя традыцыі беларускага кнігадрукавання і асветніцтва, форум атрымаў прызнанне прафесіяналаў кніжнага свету, стаў унікальнай дыялогавай пляцоўкай для гуманітарнага і культурнага развіцця. Ва ўмовах глабальнай дэвальвацыі панянццяў ісціны, дабра і справядлівасці, забароны і апаганьвання сусветнай літаратурнай класікі Мінская кніжная выстаўка садзейнічае павышэнню ролі кнігі ў фарміраванні патрыятычных каштоўнасцяў у грамадстве, умацаванню дружбы паміж народамі на аснове творчасці і ўзаемаразумення», — гаворыцца ў прывітанні. Прэзідэнт таксама выказаў удзячнасць арганізатарам, сябрам з блізкага і далёкага замежжа, а таксама ўсім, хто робіць форум змястоўным, напаўняючы яго новымі ідэямі і сэнсамі.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2023 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

# «КАЛІ ЗАБУДЗЕМ ДАРОГУ Ў ХАТЫНЬ, УСЁ ПАЎТОРЫЦЦА»

## «НЯМА АПРАЎДАННЯЎ ПАЛІТЫЦЫ ГЕНАЦЫДУ»

Пасля мінуты маўчання Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў фашызму няма чалавечага твару, але ёсць імёны. «Імёны забойцаў і здраднікаў — і мы іх ведаем, — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт. — Ёсць спадчыннікі і ідэйныя прадаўжальнікі, у якіх зноў абудзіўся ген нянавісці да нас, усёй славянскай цывілізацыі, нашага народа. «Арыйскія стандарты» яны замянілі на ліберальныя дэмакратычныя каштоўнасці. Фільтрацыя народаў на адпаведнасць новаму эталону ідзе даўно. Праз «каляровыя рэвалюцыі», мяцяжы, проксі-войны, санкцыі, шантаж. Як гэта далёка можа зайсці — мы таксама ведаем. На жаль, ужо і бачым на прыкладзе суседніх краін, дзе на руінах Хатыні аб савецкай спадчыне і Вялікай Перамозе, на абломках разбураных помнікаў воінам-пераможцам узняў галаву сучасны неанацызм».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу: мы бачым, як прачынаюцца інстынкты дзядоў — украінскіх, латышскіх, літоўскіх і польскіх карнікаў, якія кідалі ў агонь нашых дзяцей, старых і жанчын. «Таму мы абавязаны зрабіць усё, каб захаваць у гісторыі подзвіг пакалення савецкіх людзей, якія з гонарам прайшлі свой урок мужнасці і гераізму, каб Хатынь стала месцам сілы беларускага народа — гэта наш з вамі абавязак», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Звяртаючыся да моладзі, беларускі лідар адзначыў, што ганарыцца ёю. «Усімі, асабліва тымі, хто ўзяў удзел у рэканструкцыі гэтага мемарыяльнага комплексу, — удакладніў ён. — Музей, які мы сёння адкрываем пад хатынскім небам, — у тым ліку і ваша стварэнне. Усе разам мы ажыццявілі праект, заклікаваны зрабіць памяць аб жахах той вайны яшчэ вастрэйшай. Я вельмі хацеў, каб у людзей шчымела ў грудзях яшчэ да таго, як ступяць нагой на святую зямлю Хатыні. Думаю, у нас атрымалася. У Год міру і стваральнай працы мы, беларусы, гаворым выразна і гучна: няма ніякіх апраўданняў палітыцы генацыду, няма нічога больш важнага за жыццё чалавечае».

Аляксандр Лукашэнка заклікаў прыходзіць сюды часцей, прыводзіць з сабой дзяцей: сваіх, суседзяў, іншых. «Калі забудзем дарогу ў Хатынь, усё паўторыцца, — падкрэсліў ён. — Нам трэба гэтага пазбегнуць. Жыццё даражэй за ўсё».

**Вераніка КАНЮТА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# Пасля мітынгу-рэквіема, прысвечанага 80-годдзю трагедыі ў Хатыні, Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанні журналістаў

## БЕЛАРУСЬ — ПРЫКЛАД ТАГО, ЯК ТРЭБА АДНОСІЦЦА ДА ПАМЯЦІ

Спачатку прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі папрасілі кіраўніка дзяржавы падзяліцца ўражаннямі ад абноўленага мемарыяльнага комплексу і экспазіцыі музея, які з'явіўся ў Хатыні. Прэзідэнт, у сваю чаргу, пацікавіўся, як абноўлены мемарыял ацанілі самі журналісты. «У свеце я наведваў вялізную колькасць музеяў, і ў пэўнай ступені ў мяне ўжо выпрацаваўся імунітэт, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Але ў Хатыні гэтае адчуванне непаўторнае. Нельга параўнаць, па сутнасці, тое, што тут адбылося, з іншымі злачынствамі не толькі нацыстаў, але і іншых мярзотнікаў і нягоднікаў».

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што ў нас уся зямля ў помніках. Ён пагаджаецца са словамі дырэктара мемарыяльнага комплексу «Хатынь», які сказаў, што калі ў сярэднія вякі Беларусь была зямлёй замкаў, то цяпер гэта зямля помнікаў. «І мы іх захавалі, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Там, дзе калісьці нашы продкі чагосьці не стварылі, мы ствараем». У якасці прыкладу Аляксандр Лукашэнка згадаў Гомельшчыну, дзе Ала, і Магілёўшчыну, дзе Боркі... Па яго словах, Вялікая Айчынная вайна была страшнай трагедый для беларускага народа, якую мы імкнёмся адлюстраваць у помніках. І Прэзідэнт не хавае — ён заўсёды гэтым ганарыцца. Нават у аддаленых населеных пунктах ёсць такія месцы памяці і ўсе яны — дагледжаныя, туды прыходзяць дзеці, а гэта, на думку кіраўніка дзяржавы, галоўнае.

Кажучы пра рэканструкцыю мемарыяльнага комплексу, Прэзідэнт нагадаў, што яго галоўным даручэннем было — стварыць так, як было. «Калі ў выніку спецыяльнай ваеннай аперацыі байцы сутыкаюцца з вайной, а мы ж яе бачылі толькі ў кіно (гэта пампезна, гераізм — кіношнікі заўсёды імкнуцца так паказаць), аказваецца, што гэта вайна іншая», — заўважыў ён. Невыпадкова Аляксандр Лукашэнка адчуў, улавіў момант, калі даручыў ажыццявіць рэканструкцыю ў Хатыні прыземлена — блізка да таго, як усё было. Гэта датычыцца і музейнай экспазіцыі.

«Да 80-годдзя трагедыі і Бог загадаў нам навесці парадак у Хатыні, — заўважыў беларускі лідар. — Гэта наш боль, наша памяць. Гэтая памяць нас сюды і вядзе. Пакуль будзем хадзіць сюды з дзецьмі — гэтага не будзе. Забудземся тую дарогу — дакладна паўторыцца».

Разам з тым кіраўнік дзяржавы ўдакладніў, што гэта ў Беларусі мы так адносімся да згаданых падзей. «А ў іншых месцах не проста забыліся нешта, нацысты па вуліцах ходзяць», — акцэнтаваў увагу ён. Аднак для беларусаў захаванне памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, людзях, якія не дачакаліся Перамогі, з'яўляецца важным і актуальным. «Няхай гэты бессмяротны кавалак зямлі, імя якой Беларусь, будзе прыкладам таго, як трэба адносіцца да тых людзей, дзякуючы якім мы жывём», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

## «РУХАЕМСЯ ТУДЫ, ДЗЕ АДЧЫНЕНЫ НАМ ДЗВЕРЫ»

Адказваючы на пытанне аб узмацненні партнёрскіх адносін з Кітаем і Іранам, куды нядаўна ажыццявіў дзяржаўныя візіты беларускі лідар, Прэзідэнт адзначыў, што мы рухаемся ў правільным кірунку. І гэта датычыцца Расійскай Федэрацыі. «Рухаемся туды, дзе адчынены нам дзверы, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Там, дзе перад намі зачынілі дзверы (мы часта абмяркоўваем з Пуціным гэтае пытанне), навошта ў тыя дзверы ламацца? Яны да нас прыйдуць. Яны ціхенька, з-пад плінтуса, вылазяць — гандлюем і іншае. Еўропа ўжо прад'яўляе прэтэнзіі Амерыцы, што, падбухторваючы іх, амерыканцы актыўна гандлююць з расіянамі. Гэта бізнес. І гэта паршывыя палітыкі на Захадзе, якія ствараюць гэтую сітуацыю адной рукой, другой рукой спрабуюць з намі не толькі размаўляць, а гандляваць, развіваць эканоміку. Таму ідзём туды, дзе нас чакаюць. Мы робім правільна».

Краіны Захаду, у сваю чаргу, па словах кіраўніка дзяржавы, ужо зразумелі, што зрабілі няправільна, і ён растлумачыў чаму: «Мой стары візаві Болтан, які быў у гасцях, заявіў, маімі словамі, я сказаў даслоўна: вы што, звар'яцелі зусім? Перадайце свайму Прэзідэнту (тады быў Трамп), што нічога лепшага для нас, Расіі і Кітая яны не зрабілі, як аб'яднаўшы нас разам. А супраць гэтага фронту яны не выстаялі. Болтан гэта сёння паўтарыў. Таму яны шалеюць. Яны зразумелі, што зрабілі ўсё, каб нас аб'яднаць. Магутную, рэсурсную, касмічную, ядзерную дзяржаву, якой з'яўляецца Расія, і такую ж магутную, з чалавечым рэсурсам, ядзерную краіну, накіраваную ў будучыню, і ўжо, лічыце, першую краіну, Кітай, яны аб'ядналі разам».

## «ВЕЛЬМІ ВАЖНАЕ АДЗІНСТВА СПЕЦСЛУЖБАЎ, СІЛАВОГА БЛОКА І НАШАГА НАРОДА»

Ад геапалітычнай абстаноўкі журналісты перайшлі да ўнутраных праблем. Згадаўшы спыненне спробы тэрарыстычнага акта ў Мачулішчах і ліквідацыю тэрарыста ў Гродне, што на высокім узроўні ажыццявілі сілавікі, карэспандэнты спыталіся ў кіраўніка дзяржавы, ці бяспечна ў Беларусі. У гэтай сувязі Аляксандр Лукашэнка ў каторы раз падкрэсліў, што нам нельга расслабляцца. «Так, мы перамаглі ў 2020 годзе, Гасподзь нам дапамог, — адзначыў ён. — Мы да гэтага не былі гатовыя, не рыхтаваліся. Думалі, што няўжо ў нас, на гэтай святой зямлі, нешта падобнае можа адбыцца. Адбылося. Паўтарылася ў Расіі, але вопыт наш яны вывучылі і спынілі гэта ў зародку. Але ні ў якім разе ні нам, ні расіянам нельга расслабляцца. Не дай бог сітуацыя пахіснецца ў пэўны бок, заходнікі гэта выкарыстаюць імгненна».

Кажучы пра спробы тэрарыстычных актаў на тэрыторыі Беларусі, Прэзідэнт заўважыў, што падобнае для нас у навіну. «Не тое што не чакалі, якраз чакалі, і я ў тым ліку, і ваенныя», — сказаў беларускі лідар. На гэтым фоне, на думку кіраўніка дзяржавы, народ павінен згуртавацца. Звяртаючыся да людзей, Прэзідэнт папрасіў своечасова падказваць, даваць сігнал, калі нехта не выклікае давер.

Прэзідэнт расказаў, што калі была спроба тэракта ў Мачулішчах, вельмі добра адпрацавалі спецслужбы. «Тысячы людзей былі паднятыя, — удакладніў ён. — За пяць дзён вылічылі і знайшлі (тэрарыста. — **«Зв»**.). І асобныя людзі нам падказвалі, што бачылі чалавека, пэўнага колеру аўтамабіль. Пачыналі па слядах ісці, шукалі. Аднак гэтага недастаткова. Не таму, што людзі хаваліся. А таму, што людзі спакойна, бяспечна жывуць. Цяпер трэба бачыць усё, што адбываецца».

І гаворка не пра «шасцёрак». Кажучы пра затрыманне тэрарыста ў Гродне, Аляксандр Лукашэнка расказаў, што людзі інфармавалі кампетэнтныя органы. «Акрамя мярзотнікаў, якія ўзялі яго на кватэру, — удакладніў кіраўнік дзяржавы. — Яны цяпер сядзяць у засценках, мы з імі працуем. Гэта жудасныя БЧБшнікі. Чаму так адбываецца, што ўсе тэрарысты асядаюць у гэтых кватэрах?»

А потым яны ні пры чым, нічога не ведаюць. Таму перш чым здаць чужому чалавеку кватэру або нешта яшчэ, трэба прыглядзецца, а лепш праінфармаваць кампетэнтныя органы аб тым, што ў вас хочуць зняць кватэру. «Вельмі важнае цяпер гэтае адзінства спецслужбаў, сілавога блока і нашага народа, тады нам будзе лягчэй», — рэзюмаваў беларускі лідар.

## «АД ВАР'ЯЦТВА ТРЭБА СЫХОДЗІЦЬ»

Каментуючы заявы ўладаў Вялікабрытаніі наконт іх намераў паставіць ва Украіну боепрыпасы з абедненым уранам, Прэзідэнт адказаў коратка і ясна: у такім выпадку Расія паставіць Беларусі боепрыпасы з «сапраўдным» уранам. «Калі яны (брытанцы. — **«Зв»**.) вар'яты, то яны дадуць гэтаму працэсу штуршок, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Вось самае страшнае і небяспечнае. Таму ад вар'яцтва трэба крыху сыходзіць у бок. Як толькі гэтыя боепрыпасы выбухнуць на пазіцыях войскаў Расіі, вы ўбачыце: адказ будзе страшны». Па яго словах, гэта стане ўрокам для ўсёй планеты.

Пры гэтым беларускі лідар нагадаў, што ў Расіі ёсць не толькі абедненыя ўран. «Таму гэты трэнд у гэтай вайне ў плане эскалацыі і пачынаць не трэба, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Нам трэба рухацца (як казалі Пуцін з Сі Цзіньпінам) да мірнага ўрэгулявання. І расійскае кіраўніцтва, і адна з найбуйнейшых сусветных дзяржаў — Кітай, і многія-многія іншыя з гэтым згодныя».

У працяг тэмы эскалацыі Прэзідэнт нагадаў заяву польскага пасла ў Францыі аб тым, што калі яны прайграюць або будуць прайграваць ва Украіне, Польшча будзе ваяваць з Расіяй. «Палякі — недурныя людзі, але хто іх слухае, — заўважыў ён. — Там такая таталітарная краіна, што далей няма куды». Па словах кіраўніка дзяржавы, няхай паспрабуюць толькі супраць нас ваяваць. «Мы павінны цяпер не гуляць у пэўныя гульні, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Нам, беларусам і расіянам, трэба сваё глядзець. Каб нашы людзі, не дай бог, як у 1941-м, не загінулі. Усё ўлагоджвалі фашыстаў. Улагодзілі? Што пад Масквой былі праз некалькі месяцаў? Таму з гэтага трэба рабіць адпаведныя высновы».

Аднак, на жаль, у некаторых народаў, па словах кіраўніка дзяржавы, памяці няма. «Вы бачыце, якія там палітыкі? — звярнуў увагу Прэзідэнт. — У некаторых ваенных рукі свярбяць. Хоць ваенныя, я гэта ва Украіне бачу, людзі з галавой. Там амерыканцы праз Зяленскага бамбяць-бамбяць... Але людзі, якія на фронце сёння ваююць, лоб у лоб з расіянамі, не дурні: яны разумеюць, што трэба спыняцца. Але пакуль іх ніхто не слухае. Думаю, пачуюць».

## «МЫ НЕ РУХНУЛІ І НЕ РУХНЕМ»

Пераходзячы да пытанняў эканамічнай бяспекі краіны, Прэзідэнт паведаміў, што ўжо па першым квартале гэтага года пацвярджаецца яго ўстаноўка, што бягучы год павінен і будзе не горшым за мінулы. «Калі мы гэты год пройдзем, як мінулы, а яшчэ выканаем планы, якія мы намецілі на пасяджэнні ўрада, мы будзем нармальна жыць», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Устойлівасць нашай эканомікі, па словах беларускага лідара, забяспечана яшчэ і тым, што мы не разбурылі тое, што засталося нам ад Савецкага Саюза. «Мы ў савецкія часы былі самым мазгавым цэнтрам, Украіна, мы і часткова Прыбалтыка, — нагадаў Прэзідэнт. — Што засталося? Уся наша прадукцыя сёння запатрабавана, бо мы стаім на плячах савецкіх гігантаў. І оптыка, і электроніка, і лазеры, іншае — гэта ж Беларусь. Мы гэта захавалі. За некаторых кірунках эканомікі, нечакана для мяне, пераўзышлі ў шмат разоў».

Успамінаючы нядаўнюю нараду па развіцці айчыннай мікраэлектронікі, якая адбылася на базе ААТ «Планар», кіраўнік дзяржавы адзначыў, што яны проста малайцы, ні ў чым не адсталі. І няважна, што «айфон» у Беларусі пакуль не ўдацца стварыць. Затое ў нас ёсць усё для вытворчасці электрамабіляў, матацыклаў і нават ракет. Аднак праз нейкі час мы, па словах беларускага лідара, атрымаем і тое, што нам неабходна для вытворчасці «айфонаў». «Камп'ютар жа робім, — нагадаў кіраўнік дзяржавы. — Можа, і добра, што яны ўвялі гэтыя санкцыі. Мы цяпер будзем займацца сабой. Абсалютна дакладна тое, што мы не рухнулі. Так, па-рознаму жывуць людзі. Аднак мы не рухнулі і не рухнем».

## «ВЫРАШАЦЬ БУДЗЕ НАРОД»

Кіраўніка дзяржавы спыталі пра палітычную кампанію, якая будзе праходзіць налета ў краіне. Журналісты пацікавіліся, у якім стане да гэтага падыходзіць грамадства. «Калі галаву будзем у руках трымаць, усё будзе нармальна», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заўважыў, што пачатак наступнага года будзе няпростым. «Справімся з гэтым, але расслабляцца, вядома, не трэба, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Тыя мярзотнікі, якія збеглі, некалькі сотняў чалавек найбольш актыўных, павінны паказаць сваім спонсарам, што яны не проста ўмеюць у Telegram-каналах посціцца і іншае. А мэта адна — вайна. Я вас папярэджваў. Яны спрабавалі і так, і гэтак: мяцеж, каляровыя рэвалюцыі, вайна ў СМІ — яна і цяпер працягваецца. Але застаў-


Фота БелТА.

ся ў іх адзін рычаг — гэта ўзяць зброю і паспрабаваць ваяваць. Вось яны і спрабуюць прадэманстраваць, яны рыхтуюцца».

Кіраўніцтву краіны пра гэта вядома. Больш за тое, усіх тых, хто хоча дэстабілізаваць абстаноўку ў Беларусі, ведаюць паймённа. «Мы ведаем, куды яны рыхтуюцца, як рыхтуюцца, — удакладніў кіраўнік дзяржавы. — Цяпер пачалі актыўнічаць. Калі ім цяпер грошай не дадуць, час іх злічаны. Таму яны і спрабуюць даказаць, што яны штосьці могуць, і ўсё гэта — пад выбары».

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў лютым 2024 года адбудуцца парламенцкія выбары, выбары ўсіх Саветаў — адзіны дзень галасавання. Праз некаторы час адбудуцца выбары дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу, а потым — і пераход у прэзідэнцкую кампанію. «Мы рыхтуемся з пункту гледжання забеспячэння бяспекі для людзей, а астатняе — калі ласка, вы вырашайце, — кажучы аб падрыхтоўцы да выбарчых кампаній, паведаміў Аляксандр Лукашэнка. — Як заўсёды, вырашаць будзе народ. Калі вы вырашыце, што патрэбна вам іншае жыццё, — Бог з вамі, паспрабуйце».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу: у народзе кажуць, што беларусы вельмі добра жывуць. Прычым настолькі, што ўжо пачынаюць патрабаваць ад Прэзідэнта немаведама чаго. Большасці ж жыхароў краіны зразумела, што цяпер з'яўляецца галоўным — мір і спакой, якія забяспечаны на беларускай зямлі. «Я не хачу, каб было так, як сёння ва Украіне, — падкрэсліў беларускі лідар. — І не толькі ў маю бытнасць. У мяне дзеці, у многіх з вас дзеці. Хацелася б, каб дзеці жылі нармальна».

Кажучы аб пераразмеркаванні паўнамоцтваў паміж рознымі галінамі ўлады, пра што таксама спыталі ў кіраўніка дзяржавы, ён адзначыў, што патрэбны час, каб тыя, хто атрымаў паўнамоцтвы (урад, парламентарыі, губернатары і іншыя), пачалі іх рэалізоўваць. У такім выпадку, магчыма, як лічыць сам Аляксандр Лукашэнка, і яму будзе лягчэй. Аднак, як бы хто гэтыя паўнамоцтвы ні пераразмяркоўваў, на думку Прэзідэнта, беларусы — народ калектыўны, саборны.

**Вераніка КАНЮТА.**

# Мы не маем маральнага права здрадзіць памяці

**Наталля Качанава, Старшыня Савета Рэспублікі:**

— 22 сакавіка — сумная дата ў народным календары Беларусі. Гэты дзень мы перажываем з асаблівым болем — 80 гадоў таму вёска Хатынь з усімі яе жыхарамі была спалена дашчэнту фашысцкімі захопнікамі і іх паслугачамі.

Больш за 200 вёсак падзяліла горкі лёс Хатыні ў гады Вялікай Айчыннай вайны, так ніколі і не адрадзіўшыся. Звыш 10 тысяч сёл і вёсак пацярпела падчас акупацыі. Страшныя пацвярджэнні зверстваў фашыстаў на беларускай зямлі выкрываюцца да гэтага часу. Шматлікія факты сведчаць аб мэтанакіраванай палітыцы генацыду ў адносінах да насельніцтва Беларусі, якую ажыццяўлялі нацысты.

Мы, спадчыннікі пераможцаў, не маем ніякага маральнага права здрадзіць памяці пра тыя трагічныя падзеі. Мы будзем свята шанаваць несмяротны подзвіг нашых старэйшых пакаленняў і заўсёды дзякаваць ім за нашу свабоду, заваяваную такой неймаверна дарагой цаной.

Памяць аб ахвярах карычневай чумы ніколі не павінна згаснуць. Мы павінны зрабіць усё, каб гэта не паўтарылася зноў.

На жаль, бягучая геапалітычная сітуацыя, калі ўзмацняецца ваенна-палітычная напружанасць і нарастае агрэсія, папулярызуецца чалавеканенавісніцтва, зусім гэтаму не спрыяе. Мы бачым, як у шэрагу краін паднімаюць галаву рэваншысты.

Менавіта таму Прэзідыум Савета Рэспублікі прыняў рашэнне ў гадавіну трагедыі ў Хатыні звярнуцца да сусветнай супольнасці з заклікам аб недапушчальнасці рэабілітацыі нацызму, міжнародным прызнанні генацыду беларускага народа.

Мы заклікаем парламентарыяў усіх краін, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі і ўсіх тых, хто шчыра выступае за будучыню свету, да безумоўнага асуджэння ідэалогіі нацызму і супрацоўніцтва ў супрацьстаянні любым яго праявам.

Аб'яднаўшыся, мы зможам выратаваць чалавецтва і чалавечнасць.



Фота БелТА.

# ВЫРАТАВАЦЬ ЧАЛАВЕЦТВА І ЧАЛАВЕЧНАСЦЬ

## ЗВАРОТ

### Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у сувязі з 80-й гадавінай трагедыі, якая адбылася ў вёсцы Хатынь

80 гадоў не сціхае боль Хатынскай трагедыі — жорсткага сведчання барацьбы чысціні, праведнасці, праўдзівасці з канцэнтраваным злом, якое мае д'ябальскую нацысцкую сутнасць.

Абарваны мільёны чалавечых жыццяў, скалечаны лёс беларускага народа, але не зламаны наш дух, бясконцая прага міру і стваральнай працы. Мы поўныя рашучасці адстойваць праўду аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны, абараняць Вялікую Перамогу, заваяваную такой неймаверна дарагой цаной.

У сучасных рэаліях, калі разгорнута маштабная кампанія па знішчэнні нацыянальнай ідэнтычнасці, сціраецца культурная разнастайнасць, перапісваюцца падзеі мінулага, лічым сваім маральным абавязкам дабіцца ўсеагульнага прызнання факта генацыду беларускага народа. Наша бяда — вечны набат аб зверствах нацыстаў, напамін усім, хто жыве сёння.

Мы глыбока смуткуем аб усіх нявінных ахвярах нацызму, спаленых і забітых у Хатыні і іншых вёсках, гарадах, краінах, куды ўварваліся фашысцкія захопнікі. Непахісная наша вера ў канчатковую перамогу над карычневай чумой, вызваленне ад атручаных рэваншысцкімі настроямі палітыканаў, прасвятленне ўсіх асляпленых гэтай смяротнай хваробай.

Кожная асобная дзяржава абавязана засцерагаць сваё насельніцтва ад генацыду, этнічных чыстак і злачынстваў супраць чалавецтва. Наша агульная адказнасць — зберагчы для наступных пакаленняў гуманнасць, здаровы розум і ўсё тое, што называецца чалавечнасцю.

Заклікаем парламентарыяў усіх краін, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі і ўсіх тых, хто шчыра клапоціцца пра будучыню свету, да безумоўнага асуджэння ідэалогіі нацызму і да супрацоўніцтва ў супрацьстаянні любым яго праявам.

Аб'яднаўшыся, мы зможам выратаваць чалавецтва і чалавечнасць!

По сутнасці

# ФІНАЛ «БАБАЯ»



Пісаць аб калегах няпроста. Паспрабуйце адрамантаваць машыну аўтаслесару альбо пашыць касцюм для краўчыхі. Пра калег неаднойчы рабіў матэрыялы. Іспыт прайшоў. Але тое былі станоўчыя матэрыялы. Медыйныя оды. Цяпер — крытыка. Цяжка, але патрэбна. Каб болей на наступаць на граблі інфармацыйнай дыверсіі. Каб ізноў прагладства не набіла гузакоў.

Каб атрымалася як трэба, неабходна — толькі праўду. Што і казаць, партал тут.бай я чытаў. Як яго чытала ўся Беларусь. І інтэлігентныя выкладчыкі ўніверсітэтаў, і прасунутая моладзь, і кабеты з рэгіёнаў, і суровыя рабочыя заводаў, нават чыноўнікі ў высокіх кабінетах. Чыталі, нібыта ласаваліся добра прыгатаванай інфармацыйнай стравай. Чыталі і рэдактары дзяржаўных медыя. Там шукалі герояў для сваіх матэрыялаў, інфармацыйныя нагоды. Вось як атрымліваецца. Адзін і той жа «журфак» скончылі, а працуюць па-рознаму. У чым быў сакрэт прывабнасці тут.бая, чаму мы — дзяржаўныя СМІ — так тады не маглі? Прычыны дзве. Першая. Звычка — другая натура. Працэдура наладжаная. Стылістыка, метады падачы, жаданне быць усім прыемнымі... А ў век засілля сродкаў інфармацыйных зносін — гэта пройгрыш. Другая прычына рэйтынгавасці тут.бая — россып крытыкі. Канешне, схаванай за шырму прафесійнай і якаснай журналістыкі. А людзям заўжды падабаецца «гарачае», «злобнае», «крымінальнае». Праўдзіце саматэст. Ваш выбар: пропаведзь святара з царкоўнага амбона ці выступленне топавага калектыву прыгажунь? Безумоўна, залежыць ад інтэлектуальнага ўзроўню. Але канцэрт каля ратушы ў любую летнюю суботу збірае большую аўдыторыю, чым царкоўная служба. Такая вось суровая праўда грамадскай цікавасці. У тым прычына і папулярнасці тут.бая. З пярчынкай інфармацыйны «шашлык» больш даспадобы, чым звычайна прыгатаванае варыва.

І калі гэта спачатку турбавала (а мо і не) чыноўнікаў, што адказвалі за развіццё дзяржаўных СМІ, то потым выйшла за межы прафесійнага супрацьстаяння. Тут.бай ператварыўся ў інфармацыйны штаб пратэстаў. Такое не бывае адразу. Існуе кіраўніцтва, рэдакцыйная палітыка, штат аўтараў. Інфармацыйны партал — не чароўная карэта: за адну ноч не ператворыцца ў гарбуз. Гэта паступовы і спланаваны працэс. Можна, відома, сказаць, што быў запыт у грамадстве, таму і падавалі медыяпрадукт так, як жадала пратэсная частка насельніцтва. Так, журналістыка — старадаўняя прафесія, але не такая, у якой грошы нібыта вецер для флюгера. Сапраўдны журналіст раз і назаўжды адзначае сваю пазіцыю. Няма ў ёй 50 адценняў шэрага. Значыць, рэдакцыя тут.бая проста чакала свайго часу. І ён надышоў.

Кажуць, заснавальнік партала патрабаваў плюралізму думак. Было такое пры ім. Аб гэтым у сваіх паказаннях распавядаюць былыя супрацоўнікі. Але гаспадар партала сышоў у лепшы свет. Знянацку і вельмі своечасова для некаторых! Тут з тут.баем і пачалося. У медыйным доме — інфармацыйны вэрхал. А мы ж не павінны забываць, што з тут.баем раніцу пачыналі. Чыталі гэты партал і тыя, хто з кавы пачынае дзень, і нават тыя, хто — з малітвы. Карацей, то быў ужо не звычайны інтэрнэт-рэсурс. Па ўздзеянні на грамадскую думку — інфармацыйная зброя масавага значэння. Беларусы паміж сабой абмяркоўвалі артыкулы з партала. Калі б не было вось такога інфармацыйнага інструмента, то яго б варта было стварыць. Таму і стварылі. Але хто ж бенефіцыяры масавага дарадцы беларусаў?

Зрабілі вельмі прафесійна. Людзей прывучылі нібыта да якаснага прадукту. А потым упакоўка («шапка») засталася, а змест ужо — іншы. Улічваючы гібрыднасць сучасных канфліктаў, здаецца, на медыйную прастору краіны запусцілі траянскага каня. Няўжо неспадзяванка, спалучэнне розных абставін? Хутчэй гэта нагадвае паспяховую спецаперацыю іншаземных разведак.

Дастаткова згадаць, пра што пісаў партал пачынаючы з 2018 года, а мо і трошкі раней. Калі пра Прэзідэнта, дзяржаўныя святы, знакавыя падзеі ў жыцці краіны — то заўсёды з нейкай чарвяточынай, элементамі «сцёбу» і сарказму. Усё ў рамках прававога заканадаўства, але ж з падтэкстам. Почырк для мяне вядомы. Так працавалі рэвалюцыйныя газеты перад Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыямі, так працавалі «нэзалежныя» ад інтарэсаў дзяржавы СМІ Украіны перад Майданам. Ды што там, згадайце, як дыскрэдытавалі ўлады ў пачатку 1990-х. Аўтар і СМІ розныя, а метад стварэння адзіны. З такімі метадамі я пазнаёміўся ў пачатку сваёй прафесійнай дзейнасці. Маладых здольных журналістаў, асабліва з рэгіёнаў, «навучалі» свабодзе ад дзяржаўных інтарэсаў замежныя спонсары. Грошы на такія праекты выдаткоўваў усім вядомы Сорас.

Кожны негатыўны факт умела раздзімаўся, нібы паветраны шарык. І такіх збіралася ўсё больш і больш. Такім чынам узнімаўся рэйтынг. І кожны раз гэта была аплявуха дзяржаўнаму аўтарытэту. Хто спаў у шапку, дазваляючы атакаваць інтарэсы краіны, — пытанне адкрытае. Ды і самі ведамствы былі вінаватыя. Не каб аб сваіх хібах і памылках адразу казаць самім у дзяржСМІ. Не было такога. Наадварот. Некаторыя начальнікі нават пагражалі: калі што выйдзе ў свет, то яны, маўляў, ведаюць, куды патэлефанаваць. А дзяржСМІ ўсё роўна потым прыходзілася распавядаць праўдзівую інфармацыю аб тых дрэнных выпадках. Але гэта была ўжо зусім іншая пазіцыя. Загадзя — нявыгадная. Пазіцыя апраўдання.

А тут.бай быў на кані. Нават інфармацыйнай «шашкай» махаў — наперад, на барыкады. У сваіх офісах яны ўжо адзначалі перамогу. Кожны дзень. Пакуль у рэчаіснасць не вярнулі сілавікі.

Ніхто асабліва не разглядаў дзейнасць тут.бая яшчэ з аднаго боку — маральнага выхавання. А на партале ці не штодня з'яўляўся матэрыял, які ставіў пад сумненне традыцыйнасць нашага грамадства. «Псіхалягіні» (так яны самі сябе прадстаўлялі) убівалі ў галаву беларуса шмат брыдкай інфармацыі. Маўляў, блізкая сувязь з бацькамі — адхіленне, жонка неабавязкова павінна быць верная мужу і ўвогуле саюз мужчыны і жанчыны — не канстанта для сучаснага грамадства. А яшчэ з асалодай распавядалі пра розных бінарных і небінарных, пра вольныя норавы. Шмат матэрыялаў было пра суіцыды, адхіленні ад нармальных паводзінаў. Стваралася карціна, нібы беларусы — нацыя адшчапенцаў, фрылансераў, фрыкаў і хворых людзей.

І калі мне скажуць пра свабоду слова, то я адкажу. У тут.бая яна была вышэй ад іх галавы, якая закружылася ад магчымасцяў. Улады не чапалі, замежныя спонсары дапамагалі. Я добра памятаю, як «тутбаеўцы» прысутнічалі на ўсіх дзяржаўных мерапрыемствах, ніхто ім не замінаў. А яны кідалі ў бок дзяржаўных журналістаў зняважлівыя позіркі. Маўляў, хто вы, а вось мы — «свабодная прэса». Як потым ужо аказалася, свабодная ад маралі і сапраўдных інтарэсаў дзяржавы і грамадства. І не такая свабодная ад ганарараў. Чамусьці яны, нібы на дражджах, выраслі ў мяцежны перыяд 2020-2021 года. Але з гэтага «цеста» нічога не атрымалася, бо яно з самага пачатку было цвілым. Такі вось «тут бабай».

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# МАСТАЦТВА ЛЮБОВІ ДА КНІГІ


Фота БелТА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ** засяродзіў увагу прысутных на тым, што кніга сёння з'яўляецца сродкам памяці і праўды:

— Вельмі сімвалічна, што наша XXX юбілейная выстаўка адкрываецца ў дзень, калі мы згадваем ахвяр Хатыні і іншых трагічна спаленых вёсак Беларусі. Мы не маглі абысці гэтую дату, і ў гэты дзень мы падкрэсліваем ролю і месца кнігі, якая нароўні з помнікамі, абеліскамі і музеямі з'яўляецца аб'ектам памяці, тым сродкам, які нясе гістарычную памяць і захоўвае гістарычную праўду.

З нагоды такога сімвалічнага супадзення — старт кніжнай выстаўцы-кірмашу быў дадзены ў Дзень памяці ахвяр Хатынскай трагедыі, — гэтая тэма гучала ў выступленнях прысутных гасцей. Так, **спецыяльны прадстаўнік Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі па міжнародным культурным супрацоўніцтве Міхаіл ШВЫДКОЙ** сказаў пра вялікую ролю літаратуры і яе прадстаўнікоў у захаванні агульнай памяці:



— Я думаю, што кожны з прысутных сёння будзе гаварыць пра Хатынь. І гэта зразумела, таму што не думаць пра гэта і не перажываць кожны раз было б проста здрадай нашай памяці, і тым, хто загінуў, і тым, хто ў 1945 годзе вярнуўся з вайны пераможцам. І гэтая памяць аб'ядняла нас назаўсёды ў самым лепшым і высакародным сэнсе слова. Вайна — час, калі адкрываецца ў чалавеку самае высокае і самае нізкае. І высокае перамагло. І я кажу пра гэта таму, што мы сёння адкрываем цудоўную выстаўку-кірмаш у дзень памяці загінулых. Кнігі дапамагаюць пераадолець страх перад жыццём і перад смерцю, дапамагаюць ствараць жыццё, як было заўсёды ў беларускай, у рускай і ўвогуле ў вялікай літаратуры. Я меў шчасце быць знаёмым з многімі беларускімі пісьменнікамі і ведаю, што беларусы заўсёды разумелі, што атрымалі ў спадчыну. Сёння вельмі складаны перыяд у жыцці нашых краін і свету, бо ўсё будуецца наноў. Але менавіта ў гэты момант трэба быць людзьмі. І гэта, можа, самае складанае, чаму вучаць кнігі. І думаю, што гэтая выстаўка стане сімвалам таго, што ў нас не толькі агульнае мінулае, але і агульная будучыня.

У сваю чаргу, **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** спыніўся на тым, што кніга заўсёды дапамагае не толькі адкрываць і спазнаваць новае, але і ўплывае на фарміраванне асобы кожнага чытача:

— Пра Хатынь напісаны многія кнігі, і ўсе яны маюць розныя назвы. Калі толькі быў створаны мемарыяльны комплекс «Хатынь», масавым шматмільённым тыражом у выдавецтве Савецкага Саюза «Политиздат» выйшла кніга беларускага партызана, франтавіка Антона Бялевіча «Хатынь: боль і гнеў». Мабыць, у мінулыя гады ў мастацкай літаратуры кнігам у самых розных відах і жанрах не хапала вось гэтага гневу і болі. Сёння няпросты час не толькі для Расійскай Федэрацыі, але і для Беларусі, якая, запрашаючы Расію ў якасці ганаровага госця гэтай выстаўкі, гаворыць пра сваю пазіцыю. Сёння няпросты час і таму, што многія быццам бы літаратурныя адкрыцці забылі пра самыя важныя маральныя катэгорыі. І, мабыць, калі мы не згадаем гэтыя катэгорыі, адкрываючы кнігу, даючы ацэнку напісанаму на яе старонках, то мы застанёмся ў мінулых і не самых лепшых часах. Каб ісці далей, ствараць новае, каб развіваць гуманістычныя традыцыі ў літаратуры, трэба жыць мастацтвам любові да кнігі. І я хацеў бы пажадаць усім, хто прыйшоў на кніжную выстаўку, хто наведае яе ў дні яе работы, каб была любоў да чытання і мастацтва любові да кнігі.



Адлік кніжнаму святу даў запуск механічнай энцыклапедыі, дзе знайшлі адлюстраванне найважнейшыя даты выдавецкай дзейнасці ў нашай краіне, а таксама звесткі пра выдатных прадстаўнікоў беларускага кнігавыдавецтва. Ключавой ідэйнай лініяй выстаўкі-кірмашу стане Год міру і стваральнай працы. І на нацыянальным стэндзе, які дэманструе гасцям і наведвальнікам сучасныя тэндэнцыі кніжнай індустрыі, можна ў тым пераканацца. Тым больш што кніга ў сучасным свеце — не проста папяровы носьбіт інфармацыі, яна мае розныя фарматы свайго ўвасаблення, каб гарантавана трапіць у поле зроку чытача.

Так, напрыклад, летась «Белкніга» сумесна з Міністэрствам інфармацыі распрацавала і запусціла першы мабільны дадатак «Чытанка», які дае магчымасць праслухоўваць любімыя кнігі. Да сённяшняга дня ў каталогу выдання змяшчалася больш за 100 кніг, а ў дзень адкрыцця арганізатары выстаўкі пры падтрымцы Белтэлерадыёкампаніі зладзілі кнігалюбам падарунак — папаўненне аўдыёбібліятэкі вялікім блокам новых твораў.



За гады правядзення выстаўку наведалі сотні тысяч аматараў кнігі. Яна традыцыйна збірае разам пісьменнікаў, выдаўцоў і прадстаўнікоў кнігагандлю з краін блізкага і далёкага замежжа. У розныя гады ганаровымі гасцямі былі Сербія, Кітай, Францыя, Вялікабрытанія, Казахстан, Арменія і шмат іншых краін. Сёлета ганаровым госцем стала Расійская Федэрацыя. На стэндзе «Кнігі з Расіі» свае выданні прэзентуюць 14 выдавецтваў. У прыватнасці, асноўнай падзеяй стане прэзентацыя праекта «Сучасная літаратура краін СНД». Гэты праект накіраваны на ўмацаванне культурных і гуманітарных сувязяў паміж краінамі. У Мінску прадставяць тры тамы анталогіі: «Сучасная літаратура краін СНД. Проза», «Сучасная дзіцячая літаратура краін СНД» і «Сучасная літаратура краін СНД. Паэзія». Прэзентуюць таксама і анталогіі-білінгвы.

Акрамя таго, яшчэ 120 расійскіх выдавецтваў прадстаўляць свае кнігі для продажу і экспазіцый.

— Я ўдзячны Беларусі за тое, што сёння на юбілейнай выстаўцы Расія з'яўляецца ганаровым госцем. І я думаю, што кніга сёння вельмі важная, асабліва ў наш няпросты час, як пачатак, які яднае, — сказаў **прэзідэнт Расійскага кніжнага саюза Сяргей СЦЯПАШЫН.** — Чалавек, які не чытае і не ведае гісторыі, можа ператварыцца ў што заўгодна, як тое адбылося ў Хатыні. Я вельмі рады, што Расія сёння прадстаўлена нашымі пісьменнікамі, цудоўнымі кнігамі. Мы разам былі і будзем, бо, як кажа руская прымаўка, сябры пазнаюцца ў бядзе.

Нагадаем, што асноўныя мерапрыемствы выстаўкі-кірмашу пройдуць на цэнтральнай сцэне Нацыянальнага стэнда. Менавіта там на працягу ўсіх пяці выставачных дзён адбудуцца асноўныя імпрэзы, прэзентацыі кніжных праектаў.

Сёння, 23 сакавіка, пройдзе адкрыццё «Міжнароднага квартала», які ўпершыню пачынае сваю работу на выстаўцы-кірмашы. На ім будзе прадстаўлена падборка замежнай літаратуры пры садзейнічанні дыппрадстаўніцтваў, акрэдытаваных у Рэспубліцы Беларусь. Таксама сёлета будзе арганізавана работа і «Адукацыйнага квартала», але з удзелам больш шырокага кола аўтараў вучэбнай літаратуры і выдаўцоў сістэмы Міністэрства адукацыі.

А 24 сакавіка свае кніжныя радыёпраекты прадставіць канал «Культура» Белтэлерадыёкампаніі. Таксама ў гэты ж дзень стануць вядомыя імёны пераможцаў 62-га Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі». Фінал III літаратурнага стартапу LitUP, які дае магчымасць літаратарам атрымаць падтрымку ў выданні сваёй творчасці, адбудзецца 25 сакавіка. Будуць прэзентаваны кнігі і пераможцаў папярэдніх гадоў. Больш падрабязную праграму шукайце на сайце Міністэрства інфармацыі, каб дакладна трапіць на сустрэчу з любімымі кнігамі і іх аўтарамі.

**Алена ДРАПКО, фота Лізаветы ГОЛАД.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Яшчэ паўсотні банкаў у ЗША можа стаць банкрутамі



Да такой высновы прыйшоў былы віцэ-прэзідэнт фінансавай карпарацыі Lehman Brothers Лоўрэнс Макдональд, паведаміла РІА «Навіны». Ён звярнуў увагу на тое, што яшчэ 50 банкаў могуць абваліцца, пакуль амерыканскія ўлады не знойдуць вырашэння структурнай праблемы. Крах амерыканскага інвестыцыйнага банка Lehman Brothers у 2008 годзе лічаць пачатковым пунктам сусветнага фінансавага крызісу. Эксперт дадаў, што цяперашнія праблемы ў амерыканскай банкаўскай сферы падобныя да такога падзення. Ацэньваючы вывад сродкаў з рахункаў банкаў ЗША, Лоўрэнс Макдональд, які працаваў у Lehman Brothers падчас фінансавага краху 2008 года і адказваў за кіраванне пазыковымі абавязацельствамі і гандаль канверсоўнымі каштоўнымі паперамі, спрагназаваў, што рэгіянальныя банкаўскія ўстановы краіны могуць страціць сотні мільярдаў долараў. Ён таксама лічыць, што гэтыя грашовыя сродкі пяройдуць буйнейшым установам, а пасля ў казначэйскія аблігацыі.

### У КНДР колькасць жадаючых паступіць на ваенную службу ўзрасла да 1,4 млн чалавек

Колькасць маладых грамадзян КНДР, якія выказалі жаданне паступіць або вярнуцца на службу ва ўзброеных сілы, узрасла прыкладна да 1,4 мільёна чалавек. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на Цэнтральнае тэлеграфнае агенцтва Карэі (ЦТАК). Як адзначае агенцтва, колькасць такіх добраахвотнікаў павялічваецца кожны дзень па ўсёй краіне з-за «гневу і варожасці, якія растуць у адносінах да амерыканскіх імперыялістаў і іх паўднёвакарэйскіх марыянетак-здраднікаў», чые «безразважныя дзеянні, якія правакуюць ядзерную вайну», не маюць прэцэдэнтаў. Імкненне моладзі ў войска, якое падмацоўваецца «гарачай любоўю да Радзімы і халоднай нянавісцю да ворага», паказвае іх «высокія маральныя прынцыпы і жаданне абараніць Айчыну і рэвалюцыю», перадае ЦТАК.

### У Нідэрландах спынілі рух цягнікоў з-за барсучыных нор

Барсукі выкапалі норы пад чыгуначнымі пуцямі ў Нідэрландах, што прывяло да працяглага перакрывання руху на двух лініях. Пра гэта паведаміла агенцтва Associated Press. Усе цягнікі былі спынены на ажыўленай лініі паміж паўднёвымі гарадамі Дэн-Бош і Бокстэль пасля таго, як жывёлы ўкапаліся ў дамбу, якая нясе рэйкі. Кампанія Нацыянальнай чыгуначнай дарогі заявіла, што лінія будзе адключана сама меней на тыдзень. З-за дзейнасці барсукоў «рэйкі могуць прасесці, і тады бяспека руху цягнікоў не можа быць гарантаванай», адзначаецца ў заяве ProRail, кампаніі, якая абслугоўвае галандскую чыгуначную сетку. Раней у гэтым месяцы барсукі таксама закапаліся пад рэйкі каля паўночнай вёскі Малькверум у нідэрландскай правінцыі Фрысландыя, вывеўшы лінію са строю да наступнага месяца, пакуль рабочыя дамагаліся дазволу на перамяшчэнне жывёл. Справа ў тым, што барсукі з'яўляюцца ахоўнымі жывёламі ў Нідэрландах, таму чыгуначныя аператары павінны атрымаць дазвол на іх перамяшчэнне або парушэнне іх асяроддзя пражывання, перш чым можна будзе пачаць рамонт.

# ДАВАЙ ЗЛАВАЦЦА... РАЗАМ



*Аднойчы сядзелі мы з сынам на кухні і малявалі. У нейкі момант у Сымона штосьці пайшло не так, як хацелася, і ён пачаў стукаць фламастарам аб стол, ажно пакуль не зламаў «інструмент». Пры гэтым на твары было столькі напружання і злосці! «Сымон, — кажу — ты, канешне, можаш злавацца, але давай паспрабуем зрабіць гэта па-іншаму. Бо так неўзабаве зламаеш усе свае фламастары і не будзе чым маляваць. Табе ж тата падарыў баксёрскую грушу — бяжы і пабі яе». На гэта Сымон адказаў: «У мяне столькі злосці, што я не дабягу». Тады я абхапіла сваімі далонямі яго кулачкі і пачала біць падушку, якая ляжала побач на канапе. Праз некалькі секунд малы ўжо залівіста смяяўся.*

*Вельмі часта дзеці выказваюць сваю агрэсію з дапамогай кулакоў. Не раз бачыла, як малеча ў парыве злосці замахваецца на сваю маму. У мяне таксама некалькі разоў было такое. Тут псіхолагі адназначна рэкамендуюць адразу абазначыць свае граніцы, перахапіўшы руку са словамі: «Маму біць нельга, маме будзе балюча». Больш цяжкае праяўленне агрэсіі — самаагрэсія, калі дзіця пачынае біць сябе. У такой сітуацыі прыціскаем яго да сябе. Прагаворваем пры гэтым: «Сябе біць таксама нельга. Ты цудоўны. Я цябе люблю». І абавязкова выводзім дзіця на адаптацыйныя слёзы, бо ў выпадку самаагрэсіі іх адназначна не дачакаешся. (Як гэта рабіць, чытайце ў артыкуле «Слёзы — гэта нармальна...», «Звязда», 2.03.2023).*

*Калі дзіця злуецца, бацькам трэба паспрабаваць перанакіраваць агрэсію на штосьці іншае. Можна не толькі біць падушку, як гэта рабілі мы з сынам, але і рваць паперу, тупаць нагамі, «маляваць» сваю злосць, зляпіць з пластыліну тое, што не падабаецца, і расціснуць у блін. Цудоўна, калі па першым часе вы будзеце злавацца разам з дзіцем, тым самым паказваючы прыклад экалагічнага выказвання эмоцый. Баксёрская груша наогул павінна быць устаноўлена ў кожным доме, дзе нараджаецца немаўля. У цяжкія моманты ёй можа карыстаецца не толькі дзіця, але і мама з татам. Калі ваша крывіначка ў парыве злосці раз за разам псуе каштоўныя рэчы ў доме, пагаварыце з ім. Маўляў, ты можаш зламаць крэсла, але май на ўвазе — новае мы будзем набываць за твае кішэнныя грошы. Яшчэ бацькам важна памятаць, што ні ў якім разе нельга караць дзіця за тое, што яно пакуль не можа справіцца са сваімі эмоцыямі. Майце на ўвазе: спрабуючы пазбавіцца ад дзіцячай агрэсіі з дапамогай бізуна, вы толькі дадасце стрэсу. У выніку агрэсія нікуды не знікне, яе будзе яшчэ больш.*

*Выдзяляюць тры правілы эмацыянальнага інтэлекту. Па-першае, няма лішніх эмоцый. У соцыуме прынята дзяліць эмоцыі на добрыя і дрэнныя. Радавацца можна, здзіўляцца можна, натхняцца таксама можна. А вось злавацца, псіхаваць, раздражняцца — нельга. І вельмі часта мы даём дзіцяці такі пасыл: адчувай толькі станоўчыя эмоцыі! Я хачу, каб ты заўсёды радаваўся і ўсміхаўся! Але гэта немагчыма. Чалавек павінен адчуваць усе эмоцыі, бо кожная мае ўнікальнае значэнне. Без страху мы наогул не выжылі б. Злосць — вельмі энергетычна моцная эмоцыя, якая не толькі дазваляе абараніць свае асабістыя граніцы, але і шмат чаго стварыць. Таму казаць дзіцяці «не бойся», «не злуйся», «не засмучайся», тым самым падаўляючы яго эмоцыі, не варта. Бо такім чынам мы транслюем: з табой штосьці не так. Падругое, эмоцыі павінны выйсці. Бо нявыказаныя эмоцыі нікуды не знікаюць, яны назапашваюцца і рана ці позна ператворацца ў зрывы, агрэсію ці, што яшчэ горш, праблемы са здароўем. Па-трэцяе, экалагічнае выказванне эмоцый — тое, чаму мы навучаем. Калі бацькі самі не ўмеюць экалагічна — так, каб не раніць іншых, выказваць сваю злосць, смутак, раздражненне, страх, гнеў, дзіця таксама не будзе ўмець гэта рабіць.*

*Дарэчы, лічыцца, што поспех у жыцці ў многім залежыць ад таго, развіты ў чалавека эмацыянальны інтэлект ці не. Менавіта таму важна яго развіваць у любым узросце: вучыцца не толькі распазнаваць эмоцыі іншых людзей, але і браць пад кантроль уласныя, імкнуцца не дазваляць негатыўным думкам захапіць сваю свядомасць. Кажуць, прывесці свае эмоцыі і думкі ў парадак дапамагае матрыца кіравання часам, якую прыдумаў вядомы коўч Стывен Кові. Ён прапануе падзяліць усе свае справы на чатыры катэгорыі (тэрмінова важна, нетэрмінова важна, тэрмінова няважна, нетэрмінова няважна) і планаваць час пад кожную з іх. Тады ў вас застанецца менш прычын для стрэсу і вызваліцца больш месца для пазітыву ў паўсядзённым жыцці.*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Сямейная газета

Выпуск № 5 (208)

Тыя, хто побач

Таццяна ПАНОВА:

# «У дэкрэце я была тры месяцы»

**У жыцці мастацкага кіраўніка майстэрні эстраднага мастацтва «Хвілінка» Таццяны Пановай усё цесна пераплялося: сям'я і праца. Яе муж Яўген Фамбараў адзначае, што Таццяна ўмее ўсё сумяшчаць, нікога не абдзяліўшы ўвагай. З імі вельмі цікава мецъ зносіны: яркая экспрэсіўная Таццяна — з пароды тых жанчын, якія заўсёды застаюцца маладымі і дзейнымі, і Яўген — увасабленне спакою і ўпэўненасці чалавека, які ўсё моцна трымае ў сваіх руках.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*



Таццяна і Яўген.

Вы прасілі расказаць

# ДЗЕЦІ ДАЖДЖУ



## Ці можна вылечыць аўтызм?

**Дыягназ «аўтызм» упершыню ўзнік прыкладна сто гадоў таму. Але з кожным годам колькасць людзей з такой асаблівасцю расце і ў свеце, і ў Беларусі. Калі дзесяць гадоў таму ў Еўропе і ЗША на 100 дзяцей прыпадала ўсяго адно дзіця з расстройствам аўтыстычнага спектра (РАС), то цяпер такі дыягназ ужо ставяць аднаму дзіцяці з 61. І па прагнозах, частата гэтых расстройстваў будзе і далей павялічвацца.**

**Дарэчы, калі раней хлопчыкі складалі 70 % дзяцей з РАС, то ў апошнія гады гэты паказчык знізіўся да 60 %, дзяўчынкі даганяюць. Раней шлях такіх пацыентаў да атрымання дыягназу займаў у сярэднім 8-10 гадоў, а часам гэтыя расстройствы і зусім заставаліся недыягнаставанымі. Але сёння той шлях істотна скараціўся. Вядома, у адрозненне, скажам, ад сіндрому Даўна, у дзяцей з РАС няма відавочных вонкавых прыкмет, аднак ёсць паводзінскія праявы. Іх вельмі шмат, але часта бацькі не звяртаюць на іх увагі.**

**Пры гэтым важна своечасова выяўляць і карэкціраваць такія расстройствы. Бо пры ранняй арганізацыі дапамогі ў 70—80 працэнтах выпадкаў ужо да канца дашкольнага перыяду можна кампенсаваць такія асаблівасці і вучыцца ў звычайных школах. Але, вядома, часткі гэтакіх дзяцей спатрэбяцца спецыяльныя ўмовы для навучання.**

**У якім узросце найлепш дыягнаставаць расстройства? Якія яго прыкметы і прычыны з'яўлення? Пра гэта і іншае размаўляем з нейрахірургам, навуковым супрацоўнікам аддзялення пухлін галаўнога мозга РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчыкам кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гуменам ГАРБАНІДЖАДАМ.**

***— Доктар Гумен, 2 красавіка адзначаецца Міжнародны дзень распаўсюджвання інфармацыі пра аўтызм. Чаму такая ўвага да гэтага расстройства? І навошта нам усім пра яго ведаць?***

— Па-першае, з 60 чалавек, якіх мы сустракаем, адзін мае аўтызм. Гэта дастаткова частая з'ява. Таму мы павінны ведаць пра яго і разумець гэтых людзей. Па-другое, тыя, хто мае аўтызм, не падобныя адзін да аднаго. Паколькі ў дзяцей гэта частая паталогія, бацькам варта быць уважлівымі, каб своечасова заўважыць і дыягнаставаць расстройства. Ранняя дыягностыка пакідае доктару больш часу для лячэння і карэкцыі. Таму бацькі таксама павінны ведаць пра аўтызм.

***— Вы сказалі, што людзі з аўтызмам не падобныя адзін да аднаго. Але ці ёсць нейкія агульныя прыкметы РАС?***

— Безумоўна. І сярод іх можна вылучыць тое, што такія людзі з цяжкасцю знаходзяць агульную мову з іншымі, ім складана ўступаць у кантакт і камунікаваць. Акрамя таго, у іх павышаная адчувальнасць да ўсяго, што адбываецца, або, наадварот, абыякавасць — гіпер- ці гіпаадчувальнасць. Іх могуць раздражняць дробязі, на якія іншыя людзі не звяртаюць увагі, альбо, наадварот, яны ніяк не рэагуюць на тое, да чаго мы ўсе неабыякавыя. І яшчэ адна прыкмета — нават маленькая задача выклікае стрэс. Каб нешта выканаць, патрэбны неймаверныя намаганні, — літаральна зрушыць горы.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Сітуацыя

# Тыя, якія памыліліся

## У Беларусі імкнуцца далучыць медыятараў да спраў «цяжкіх» непаўналетніх

**Хлопчык-гімназіст з добрай сям'і аднойчы скраў з крамы цукеркі і папаўся. У яго пытаюцца: «Ты пайшоў купіць ласунак, і ў цябе не хапіла грошай?» — «Не, у мяне іх і не было». Значыць, ішоў красці мэтанакіравана. «А каторы раз ты ўжо так робіш?» — «Трэці». Другому хлопчыку яшчэ і дзесяці гадоў не было, а ён ужо некалькі разоў сыходзіў з дому і жыў у гаражах. Пасля, гадоў у 11, краў слоікі з закаткамі. Потым удзельнічаў у гвалтаванні, а на судзе казаў, што не разумеў, што адбываецца, а проста дапамагаў трымаць рукі ахвяры. Тады ўсё абышлося без пакарання. Нарэшце, калі яму было 13, разам са старэйшым братам ішоў па вуліцы, і кампанія выпівох папрасіла ў іх грошы на піва. Хлопчык дастаў ножык і зарэзаў аднаго з тых, хто прасіў...**



Фота Ірыны СІДАРОК.

Рабочая сустрэча медыятараў са спецыялістамі, зацікаўленымі ў дапамозе «цяжкім» падлеткам.

Гэтыя маленькія гісторыі дзіцячых лёсаў, здаецца, розныя, але падобныя тым, што патрабавалі своечасовай і адпаведнай дапамогі. Цэнтр «Медыяцыя і права» сумесна з зацікаўленымі ўстановамі краіны пачынае праект па прымяненні медыяцыі (дасудовага мірнага вырашэння канфлікту) у дзейнасці камісій і інспекцый па справах непаўналетніх, каб дапамагчы дзецям, якія трапілі ў складаныя сітуацыі канфлікту з законам. Прычым дапамагчы своечасова, пакуль яшчэ можна выправіць і дзіця, і яго шлях.

### ГЛЯДЗЕЦЬ ВАЧЫМА ДАПАМОГІ, А НЕ ПАКАРАННЯ

Цэнтр «Медыяцыя і права» пры Беларускім рэспубліканскім саюзе юрыстаў з 2015 года працуе над рэалізацыяй розных сацыяльных праектаў, у прыватнасці над укараненнем службаў медыяцыі ў школах, а таксама над прымяненнем медыяцыі для дапамогі падлеткам, якія знаходзяцца ў канфлікце з законам. Юрысты плануюць далучыць медыятараў да работы ў камісіях і інспекцыях па справах непаўналетніх. Адзінкавыя выпадкі такога ўдзелу медыятараў у вырашэнні праблем «цяжкіх» падлеткаў ужо былі, аднак гэтага вельмі мала, — лічыць **Ірына АРЛОЎСКАЯ, кіраўнік Цэнтра «Медыяцыя і права», выканаўчы дырэктар аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў»**:

— Мы плануем навучыць аднаўленчым медыятыўным практыкам 20 чалавек з розных устаноў, якія цесна звязаны з малалетнімі парушальнікамі закона, калі тыя трапляюць у складаныя сітуацыі. Гэта настаўнікі школ; удзельнікі камісій па справах непаўналетніх (КСН), у склад якіх уваходзяць прадстаўнікі дзяржорганаў, устаноў і арганізацый, якія ажыццяўляюць прафілактыку безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх; прадстаўнікі інспекцый па справах непаўналетніх (ІСП), якія складаюцца з супрацоўнікаў Міністэрства ўнутраных спраў. Навет калі гэтыя спецыялісты пройдуць не паўнавартаснае навучанне, а гэткі паскораны курс, падчас якога азнаёмяцца з асноўнымі прынцыпамі работы медыятара, яны ўсё роўна ўжо змогуць бачыць і знаходзіць выхад з сітуацыі мірным (медыяцыйным) шляхам без крымінальнага пакарання падлетка.

> **«Юрысты плануюць далучыць медыятараў да работы ў камісіях і інспекцыях па справах непаўналетніх. Адзінкавыя выпадкі такога ўдзелу медыятараў у вырашэнні праблем «цяжкіх» падлеткаў ужо былі, аднак гэтага вельмі мала».**

Прадстаўнікі ўсіх гэтых арганізацый разам з медыятарамі цэнтра прысутнічалі на рабочай сустрэчы, дзе разам намагаліся прыдумаць, як і з каго стварыць тую самую групу спецыялістаў-ратавальнікаў, якія змогуць глядзець на сітуацыю вачыма медыятара, а не сячы з-за пляча. А яшчэ — зразумець, наколькі глыбока трэба вывучыць спецыфіку медыяцыі, каб з яе дапамогай ратаваць юныя лёсы падлеткаў, якія памыліліся.



— Мы можам даць скарочаны курс, падчас якога ўдзельнікі даведаюцца пра асновы медыятыўных практык, пра асаблівасці правядзення перагавораў у крымінальна-прававым канфлікце, навучацца правільна ставіць пытанні, — растлумачыла Ірына Арлоўская. — А на пляцоўцы Саюза юрыстаў мяркуем стварыць рабочую групу і падрыхтаваць метадычныя рэкамендацыі для работы. І па кожным выпадку напісаць аднаўленчую праграму.

### ПАРУШАЛЬНІК-ПАЧАТКОВЕЦ І СІСТЭМНЫ ЗЛОДЗЕЙ

Падлеткі, якія знаходзяцца ў канфлікце з законам, — далёка не заўжды крымінальныя злодзеі. Найчасцей гэта дзеці, якія проста памыліліся, упэўнены медыятары (спецыялісты па дасудовым вырашэнні канфліктаў). Ёсць малыя, якія сыходзяць з дому бадзяжнічаць на тыдзень, на месяц, і часта не таму, што ім гэта падабаецца, а таму, што дома невыносныя ўмовы для жыцця. Але іх, як і тых, хто мэтанакіравана выпівае, крадзе і паводзіць сябе агрэсіўна, ставяць на ўлік. Дапамагчы ім выправіцца і змяніцца, напэўна, можна, — і лепш рабіць гэта не праз накіраванне ў спецыялізаваныя ўстановы, а з дапамогай медыяцыі.

Падлеткавыя справы для медыятараў вельмі цяжкія, нашмат больш цяжкія, чым нават бізнес-разборкі «на мільён», таму ў такіх справах медыятары працуюць удвух, сцвярджаюць спецыялісты.

Вучыцца з дапамогай медыяцыі вырашаць канфлікты лепш на практычных выпадках, таму спецыялісты хочуць сабраць розныя гісторыі і стварыць з іх каля 10 кейсаў (выпадкаў) з рэальных сітуацый, у якія трапляюць падлеткі.

Прычым карыснымі для разбору могуць стаць і тыя выпадкі, калі непаўналетні ўпершыню сутыкнуўся з парушэннем закона, і тыя, дзе падлетак ужо лічыцца «зацятым злодзеем»,

> **Вучыцца з дапамогай медыяцыі вырашаць канфлікты лепш на практычных выпадках, таму спецыялісты хочуць сабраць розныя гісторыі і стварыць з іх каля 10 кейсаў (выпадкаў) з рэальных сітуацый, у якія трапляюць падлеткі.**

упэўнены спецыялісты, якія працуюць з дзецьмі, што трапілі ў поле зроку адпаведных органаў:

— Калі правапарушэнне здзейснена ўпершыню, падлетка яшчэ можна спыніць. Хтосьці ўвогуле «за кампанію» проста рашыўся на нешта. Ды і па сям'і потым відаць, выпадкова падлетак у нешта ўвязаўся ці да гэтага пакрысе ўсё ішло. Магчыма, трэба гэты працэс скіраваць у бок школы, каб медыятары маглі дапамагаць падлеткам яшчэ да таго, як іх справа будзе накіравана ў камісію па справах непаўналетніх.

Для большага разумення, як працуе медыяцыя, спецыялісты прывялі прыклад, дзе ўдалося выправіць не толькі дзіцячы лёс, але і стасункі цэлай сям'і.

### МЕЛАДРАМА ПАД НАЗВАЙ ЖЫЦЦЁ

Жыла-была 13-гадовая дзяўчынка, якая білася са сваімі аднакласнікамі. З-за чаго? А проста з-за нейкіх сваіх унутраных уяўленняў справядлівасці. Перавялі яе ў іншы клас, а яна кажа: «Я ўсіх тых запомніла і ўсё роўна буду біць, бо яны кепскія». Што рабіць з ёй, не ведалі, і дырэктар школы ў роспачы напісала на яе заяву ў камісію па справах непаўналетніх. У гэты самы час пра аматарку боек даведаліся медыятары, якія вырашылі паспрабаваць дапамагчы.

На першай сустрэчы школьніца нагадвала вожыка, які колецца і... брыдка лаецца. Медыятар падышоў да яе і сказаў:

— Хачу выказаць табе сваю павагу. Ты вельмі настойлівая і мэтанакіравана ідзеш па сваім шляху. Дарога ў цябе кепская, але ідзеш ты па ёй прыгожа.

Трэба сказаць, што за год да гэтага яе ўжо ледзь не адправілі ў спецыялізаваную ўстанову ў Магілёве (крыху не хапіла правапарушэнняў). Дзяўчынка пасля гэтых слоў здзівілася, а пасля пачала расказваць:

— Калі я б'ю аднакласнікаў, я ўключаю рэжым неадэкватнасці, і калі перамагаю — адчуваю сябе чалавекам. Я падкормліваю ката, але забраць яго дахаты не магу, бо ў мамы алергія. А яшчэ я крыўдую на бацьку, бо ён не хваліць мяне, не любіць, а любіць толькі сваіх новых дзяцей.

Да перагавораў з медыятарамі дзяўчынка была гатовая, але ніякіх вынікаў не чакала, бо была ўпэўнена, што нікому не патрэбная. І медыятары пачалі рыхтаваць медыяцыйную сесію паміж школай і сям'ёй дзяўчынкі. На першай жа сустрэчы высветлілася, што размаўляць паміж сабой родныя людзі не ўмеюць — зрываюцца на крык. Маці абуралася, у прыватнасці: «А чаму бацька да нас не далучаецца?» Таму запрасілі на сустрэчу і тату дзяўчынкі. А той кажа:

— Не ведаю я, што рабіць. Можа, хай едзе ў Магілёў? Магчыма, там яе навучаць.

Такім чынам, самыя родныя людзі «скінулі» яе з вуліку. Тады пазванілі старэйшай сястры, якая ўжо жыла асобна, і тая таксама пачала крычаць, што гатовая ўжо забраць сястру да сябе, бо маці не спраўляецца.

Тады медыятары сабралі разам усю гэтую сям'ю і спыталі ў дзяўчынкі, чаго яна хоча. І тая звярнулася да бацькі:

— Тата, а хто я для цябе?

— Ты мой першынец, і я табой вельмі ганаруся. Памятаю, як ты ў пятым класе рабіла цудоўныя рэчы на ўроках працы.

Дзяўчынка заплакала і кінулася да бацькі абдымацца са словамі: «А я думала, ты мяне не любіш!»

І вось тут далучыліся медыятары, якія, як кажа **Міхаіл МАЦКЕВІЧ, начальнік аддзела практычнай медыяцыі цэнтра «Медыяцыя і права»**, выступілі перакладчыкамі на зразумелую мову.

— Твой бацька ад адчаю сказаў, каб ты ехала ў Магілёў, ён спадзяваўся, што там табе дапамогуць, бо сам ён і твая мама не ведалі, што рабіць.

І было відаць, як у гэтых людзей мяняецца ўспрыманне адно аднаго. Сыходзілі яны, абдымаючыся.

Гісторыя скончылася добра. Наладзіліся стасункі з бацькам і яго новай сям'ёй. Дзяўчынка ўзялася за вучобу, дадаткова займалася з настаўнікамі на канікулах у межах медыятыўнага пагаднення, якое падпісалі школа і бацькі падлетка.

**Ірына СІДАРОК.**

# ДЗЕЦІ ДАЖДЖУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

У кампаніі, у грамадстве людзі з аўтызмам адчуваюць сябе дыскамфортна, можна сказаць, што яны асацыяльныя. Але пры гэтым не ўсе асацыяльныя людзі маюць аўтызм, гэта можа быць проста пэўнае псіхічнае расстройства. Акрамя таго, асацыяльнасць можа быць звязана з павышаным інтэлектам — такім людзям часта нецікава працягла кантактаваць з навакольнымі.

Часта людзі з аўтызмам не могуць засяродзіцца, калі ёсць старонні гукі. Калі брэша сабака, гэта не дае ім думаць ні пра што іншае, бо ўся інфармацыя, якая ёсць навокал, паступае ў галаўны мозг. Ён не можа «адсякаць» няважнае і непатрэбнае.

***— Ці праўда, што аўтызм больш характэрны для хлопчыкаў?***

— Раней сапраўды вучоныя лічылі, што хлопчыкі ў пяць разоў часцей хварэюць на аўтызм. Цяпер меркаванні вучоных разыходзяцца, усё часцей гавораць пра тое, што ў дзяўчынак аўтызм сустракаецца гэтак жа часта, але дыягнастуецца нашмат складаней.

***— З якіх прычын з'яўляецца аўтызм?***

— Ёсць розныя тэорыі, да канца тое невядома. Асноўнай прычынай лічыцца генетычная. Прычым яна залежыць ад мноства абставін. Напрыклад, вучоныя Пітсбургскага ўніверсітэта прыйшлі да высновы, што павышанае забруджванне паветра можа павялічваць колькасць выпадкаў аўтызму ў дзяцей. Ген МЕТ, які «адказвае» за РАС, у тры разы часцей актывізуецца пры павышаным забруджванні паветра. Даследчыкі заўважылі, што калі часцінкі, якія забруджваюць паветра, меншыя за 2,5 мікрона, яны могуць трапіць непасрэдна ў лёгкія і актывізаваць гэты ген. Адпаведна, калі больш за названую велічыню, то забруджванне паветра не ўплывае на гэты ген.

Французскі інстытут Пастэра таксама вывучае дадзеную праблему. Вучоныя выявілі, што пэўны набор генаў знішчае іншыя гены, і яны лічаць, што гэта шлях барацьбы з названым захворваннем. Але на цяперашні час не існуе лекаў для лячэння аўтызму. Кожны доктар кожнае дзіця лечыць па-свойму: і прэпаратамі, і рознымі методыкамі карэкцыі.

***— Ёсць меркаванне, што прышчэпкі выклікаюць аўтызм...***

— Так, гэта адзін з міфаў пра аўтызм. Калі мы не ведаем прычын, у нас пачынаюць з'яўляцца розныя канспіралагічныя тэорыі. Мы шукаем абставіны там, дзе іх няма. Вучоныя не ведаюць прычын, а людзі самі ставяць дыягназ і знаходзяць яму тлумачэнні.

Гэтак жа можна сцвярджаць, што аўтызм не звязаны ні з характарам маці, ні са з'яўленнем гаджэтаў.

***— Агульнавядома, што аўтызм мелі многія знакамітыя вучоныя. Ёсць меркаванне, што сярод аўтыстаў часта сустракаюцца геніі. Пра гэта і фільм «Чалавек дажджу» з бліскучым Дасцінам Хофманам у галоўнай ролі. У людзей з аўтызмам сапраўды ёсць пэўныя звышздольнасці?***



— Аўтызм праяўляецца ў рознай ступені. Ёсць цяжкая, і гэта людзі з паніжаным IQ, якія з цяжкасцю размаўляюць і патрабуюць пастаяннага догляду. Яшчэ адна форма — атыпічны аўтызм. Яго цяжка дыягнаставаць, тут патрэбная прафесійная дыягностыка.

А ёсць катэгорыя людзей з так званым сіндромам Аспергера. Яны могуць самастойна жыць, не надта маючы патрэбу ў старонняй дапамозе. І, як правіла, гэта вельмі разумныя людзі. Многія вядомыя людзі, прафесары маюць названы сіндром. Гэта вучоныя Альберт Эйнштэйн, Чарльз Дарвін, Ісаак Ньютан, акцёры Энтані Хопкінс і Робін Уільямс, кампазітар Вольфганг Амадэй Моцарт, стваральнік кампаніі Microsoft Біл Гейтс, рэжысёр Стэнлі Кубрык, 16-ы прэзідэнт ЗША Аўраам Лінкальн, генеральны дырэктар Tesla Motors Ілан Маск, экалагічная актывістка Грэта Тунберг.

Доктар Сціўен Шор, прафесар універсітэта Адэльфі ў ЗША, сусветна прызнаны эксперт па аўтызме, у дзяцінстве сам атрымаў дыягназ «сіндром Аспергера і аўтызм». Ён напісаў кнігу «За сцяной». Іншы прафесар у ЗША, паспяховы матэматык, з-за аўтызму не можа самастойна адчыняць дзверы, каб зайсці ў лекцыйную залу, ездзіць на веласіпедзе і рабіць элементарныя бытавыя рэчы, але рашае найскладанейшыя ўраўненні.

Усе гэтыя людзі робяць рэчы, не характэрныя для большасці, у тым ліку ідуць на рызыкі. Напрыклад, Ілан Маск можа з лёгкасцю страціць некалькі мільярдаў долараў, а потым зноў іх зарабіць. Калі на гэта глядзець рацыянальна, чалавек ніколі не пойдзе на такія рызыкі. Калі адключаюцца адны ўчасткі галаўнога мозга, моцна актывізуюцца іншыя. Мы можам убачыць гэта на прыкладзе, калі чалавек слепне — у яго моцна развіваецца слых.

***— Як своечасова заўважыць і выявіць аўтызм?***

— Тут уважлівымі павінны быць і бацькі, і ўрач-педыятр. Важны момант, што яўныя сімптомы аўтызму ёсць, але бацькі не жадаюць заўважаць іх. Напрыклад, указальны жэст пальцам разумеюць нават некаторыя жывёлы, а дзіця з аўтызмам проста глядзіць на палец. Ці, скажам, вельмі позна пачынае размаўляць. Або не гуляе з цацкамі, а толькі з пэўнай іх часткай — торамі ад машынкі. Ці гуляе толькі са сваімі цацкамі, а не з іншымі дзецьмі. Гэта яўныя сімптомы. Але бацькі замест таго, каб звярнуцца да доктара і атрымаць прафесійнае лячэнне, пачынаюць прыдумваць розныя апраўданні: «Маё дзіця разумее такія словы, якія дарослыя не разумеюць» ці «У яго цікавыя цацкі, таму яно не гуляе з іншымі дзецьмі». Тут не варта займацца самападманам. Чым раней прызнаем, што ў дзіцяці маецца РАС, і зоймемся лячэннем, тым лепш і бацькам, і дзіцяці. Чароўных таблетак не існуе, тут патрабуецца цэлы комплекс мерапрыемстваў па карэкцыі паводзінаў, і чым раней пачаць іх выконваць, тым большая эфектыўнасць.

***— Працягласць жыцця людзей з аўтызмам адрозніваецца ад сярэдняй?***

— Трэба сказаць, што дзеці з такімі сімптомамі дзеляцца на тры катэгорыі: тыя, якія змогуць жыць без старонняй дапамогі; тыя, каму часам патрабуецца дапамога; і тыя, каго нельга пакінуць нават на пяць хвілін. Ці адрозніваецца іх працягласць жыцця? Так, сярэдняя працягласць жыцця людзей з аўтызмам меншая. І звязана гэта толькі з тым, што яны нярэдка трапляюць у сітуацыі, што пагражаюць іх жыццю.

Таму гэтых дзяцей варта як мага раней навучыць плаваць, бо яны часта тонуць не толькі ў рэчцы або возеры, а нават у ваннай, калі на пару хвілін застаюцца без увагі. У ЗША быў выпадак, калі дзіця застрэліў паліцэйскі: хлопчык быў цемнаскурым, у яго быў аўтызм, а паліцэйскі ацаніў яго паводзіны як пагрозлівыя. Часам дзеці гінуць, бо ім своечасова не могуць аказаць медыцынскую дапамогу: яны не кажуць, што з імі адбываецца. Калі абвастрыўся апендыцыт, такое дзіця не можа растлумачыць, што ў яго баліць жывот.

Варта сказаць, што бацькам з гэтымі дзецьмі патрэбна вельмі моцная нервовая сістэма. І ўрач, які вядзе такое дзіця, мусіць ацэньваць і псіхалагічны стан бацькоў. Магчыма, ім таксама неабходна прымаць заспакаяльныя прэпараты.

Але ў многіх выпадках аўтызм удаецца істотна карэкціраваць нават у дашкольным узросце. Важа толькі своечасова яго выявіць. Таму калі ў бацькоў ёсць падазрэнні, што з малым не ўсё добра, не варта саромецца звярнуцца да доктара і прайсці абследаванне. Да таго ж, як бачым, многія дзеці з аўтызмам маюць розныя таленты і часта становяцца папулярнымі.

**Алена КРАВЕЦ.**

## Магчымыя сімптомы РАС у дзіцяці ва ўзросце ад 1,5 года

### Праблемы з камунікацыяй:

няма цікавасці да іншых людзей (аднагодкаў, дарослых), аддае перавагу адзіноце, гуляе сам з сабой;

пазбягае візуальнага кантакту, адводзіць вочы ў бок;

не адгукаецца на сваё імя;

не глядзіць, куды яму паказваюць;

няма ўказальнага жэсту;

не любіць абдымкаў, абыякавы да бацькоў (не заўважае іх прысутнасці-адсутнасці);

адсутнасць да гэтага часу маўлення.

### Праблемы ў быце:

не любіць пераадзявацца;

не дазваляе сябе стрыгчы;

мае парушэнні сну (дрэнна засынае, часта прачынаецца);

вельмі пераборлівае ў ежы, есць нешта адно (з-за гэтага могуць развіцца як дыстрафія, так і атлусценне);

страхі (боязь гучных гукаў, яркага святла, новых уражанняў);

схільнасць да стэрэатыпных паводзінаў (напрыклад, у дзіцячы садок ходзіць толькі адным маршрутам, змены ў маршруце могуць прывесці да нервовага зрыву).

### Дзіўныя паводзіны:

часта круціцца на месцы, ківаецца ці б'ецца галавой;

адсутнасць гульняў, у якіх патрабуецца ўяўленне (напрыклад, проста расстаўляе цацкі ў рад ці круціць кола ў машынкі);

ходзіць на дыбачках;

накіроўвае агрэсію на навакольных або на сябе;

адсутнасць элементарнай асцярожнасці, неадчувальнасць да болю.

З нагоды

# Следам за сонейкам,

## або Як стаць «Зорачкай»?

**Заўтра, 24 сакавіка, на сцэне Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, што па вуліцы Фабрыцыуса, 5 у Мінску, адбудзецца канцэрт узорнага ансамбля песні і танца «Зорачка». Прысвечаны ён 60-годдзю гэтага заслужанага аматарскага дзіцячага фальклорнага калектыву, які з'яўляецца лаўрэатам шматлікіх конкурсаў і фестываляў.**

Юбілейная праграма называецца «Следам за сонейкам». Будуць гукаць вясну, спяваць масленічныя песні, вадзіць купальскія карагоды, асобным блокам запланаваны дзіцячыя гульні і забавы. На канцэрт могуць трапіць усе ахвотныя — уваходны білет каштуе ўсяго пяць рублёў. Хто ведае, можа, паглядзеўшы на таленавітых хлопчыкаў і дзяўчынак у беларускіх строях, вы таксама захочаце аддаць у ансамбль сваіх беларусікаў?

Напярэдадні юбілейнага канцэрта мы пацікавіліся ў **кіраўніка калектыву Алы НАВІЦКАЙ,** як можна трапіць у шэрагі «Зорачкі»? І чаму бацькам варта звярнуць увагу менавіта на заняткі фальклорам?

— «Зорачка» — першы ў нашай краіне дзіцячы ансамбль, які на прафесійнай аснове звярнуўся да традыцыйных народных гульняў і абрадаў, да этнаграфіі, да фальклору ў цэлым, — кажа Ала Навіцкая. — Лічу, што кожны беларус павінен ведаць традыцыі сваёй краіны, разумець, для чаго яны былі створаны. Дзеткі, якія да нас прыходзяць, вучацца любіць і разумець прыроду. Гэта любоў прывіваецца праз абрады (для кожнай пары года характэрныя свае), гульні, забавы, пацешкі. Фальклор — гэта цудоўны сродак выхавання — і эстэтычнага, і фізічнага, і псіхалагічнага, — гэта перадача вопыту, мудрасці нашых продкаў. У нашым ансамблі дзецям прывіваюцца такія рысы, як акуратнасць, цярпенне, сабранасць. Яны вучацца адказваць за сваё ўчынкі, узаемадзейнічаць у камандзе. Нашы хлопчыкі ніколі не дазволяць сабе прыйсці на рэпетыцыю ў брудных шкарпэтках ці непрычасанымі, бо ім самім будзе сорамна перад дзяўчынкамі. У «Зорачцы» аб'яднаны ў адно харэаграфія, вакал, аркестр, таму тут адбываецца гармонічнае выхаванне — і музычнае, і рытмічнае, і разумовае. У нас усе тэксты песень на беларускай мове, таму дзіця адначасова вывучае родную мову і пашырае кругагляд.



Удзельнікам ансамбля — ад чатырох да 32 гадоў. Сярод іх ёсць нават унукі першых выпускнікоў. Ёсць сямейныя пары, якія ўтварыліся ў ансамблі, і яны потым таксама прыводзяць сюды сваіх дзетак. У нашым калектыве шмат брацікаў і сястрычак са шматдзетных сем'яў. Маленькіх дзетак стараемся адразу зацікавіць. Для гэтага ёсць і гуселькі, і шумавыя музычныя інструменты. Урок будуем на аснове фальклорных гульняў. Акрамя таго, у нас шмат паездак, часта наведваем розныя краіны з гастролямі. Такім чынам, дзеці пазнаюць не толькі свой фальклор, але і традыцыйную культуру іншых народаў.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

# НЕ СПАДЗЯВАЙЦЕСЯ НА «АВОСЬ»

## 99 працэнтаў дзіцячых апёкаў можна прадухіліць

**Людміла разам з мужам і маленькім сынам прыехала ў вёску праведаць сваю маці. Пакуль дарослыя сядзелі на кухні і пілі чай, хлопчык, якому было каля трох гадкоў, бегаў туды-сюды па хаце. «Алежка, не лезь! Алежка, не чапай!» — раз-пораз казалі малому то маці, то бабуля. Але малы непаседа працягваў з цікавасцю даследаваць тэрыторыю...**

На невялічкім століку побач з печкай стаяла электраплітка, на ёй — чайнік. У нейкі момант хлопчык ускараскаўся на ўслончык, той, відаць, пахіснуўся, і малы, падаючы, зачапіў чайнік і вывернуў на сябе кіпень, які ў ім быў. «Хуткая» даехала ў вёску без прамаруджвання, Алежку адразу ж забралі ў рэанімацыю апёкавага аддзялення дзіцячай абласной бальніцы. Некалькі дзён урачы змагаліся за яго жыццё, але, на жаль, выратаваць дзіця так і не ўдалося... Гэты няшчасны выпадак здарыўся 20 гадоў таму. Але я згадваю яго кожны раз, калі чую ў навінах пра чарговую недарэчную дзіцячую траўму...

**Апёкі — адна з самых распаўсюджаных бытавых траўм у дзяцей. Часцей іх атрымліваюць хлопчыкі і дзяўчынкі ва ўзросце ад 1 да 3 гадоў.**

Як бы ўважліва вы ні сачылі за дзіцем, траўмы ўсё адно здараюцца. Самыя распаўсюджаныя з іх — апёкі. Пра тое, што трэба рабіць (і чаго рабіць нельга ні ў якім разе), калі дзіця атрымала апёк, нагадаем у гэтым артыкуле.

### «ТАТАЧКА, СУПАКОЙСЯ»

Перш чым прывесці парады медыкаў, распавяду гісторыю яшчэ адной сям'і. На шчасце, яна з добрым фіналам. «Так атрымалася, што для нас кіпень — гэта балючая тэма, — падзяліўся з нашай газетай тата дзевяцігадовай Машы. — Упершыню дачка апарылася на другі дзень пасля свайго першага дня нараджэння. Ёй быў годзік, і яна толькі навучылася хадзіць. Мы якраз пераехалі на новую кватэру і яшчэ дрэнна ацэньвалі магчымасці дачушкі, нават не маглі падумаць, што яна ўжо зможа дацягнуцца да высокага стала на кухні. Раніцай мы прачнуліся ў добрым настроі. Я заварыў усім чай. Дачка ў гэты час тупала побач. Мы з жонкай збіраліся снедаць і накрывалі святочны стол, бо ў гэты дзень да нас якраз павінны былі прыехаць у госці Машыны хросныя. Але планы памяняліся ў адно імгненне. Малая падышла да стала, пацягнула кубак за ручку... і вывернула на сябе толькі што запараную гарбату. Гэта было страшна. Мы, вядома, вельмі спалохаліся. Але хачу сказаць дзякуй універсітэту за веды па медыцыне. Я машынальна скеміў, што трэба хутка зняць з малой адзенне, паставіў яе ў ванну пад прахалодную ваду. Пакуль жонка ахалоджвала месцы апёку, я хуценька пабег у аптэку за пантэнолам, па дарозе выклікаў «хуткую». Калі прыехалі медыкі, я ўжо паспеў апрацаваць месцы апёку пантэнолам. Той дзень і ноч Маша правяла ў рэанімацыі, потым тыдзень — у бальніцы. Дзякуй богу, кіпень не трапіў малечы на твар. Ды і на плячы ды ножцы ніякіх шрамаў не засталося.

Другі раз няшчасце здарылася, калі дачцэ было 4 годзікі. Гэта было зімой, памятаю, забраў яе з дзіцячага садка. Прыйшлі дадому, чую, шморгае носам. Думаю, трэба, паводле дзедаўскага метаду, даць ёй для прафілактыкі падыхаць парай. Наліў у міску кіпеню, накапаў эфірнага алею. Паставіў перад Машай і кажу: «На, дыхай». ...А яна неяк нязграбна ўперлася рукамі ў край міскі і вывернула яе на сябе. На грудзі, на жывот, на плячо. Я тады спужаўся больш, чым дачка. Гэта такое нясцерпнае пачуццё, калі ты разумееш, што прычыніў дзіцяці жудасны боль з-за свайго глупства. Я, як і першы раз, зняў з яе адзенне, аднёс у ванну і паставіў пад халодную ваду. На мне, відаць, не было твару, бо Маша пачала праз слёзы казаць мне: «Татачка, татачка, супакойся». Зноў прыехала «хуткая» і забрала дачку ў рэанімацыю. Потым я разам з ёй ляжаў у апёкавым аддзяленні. І зноў жа, можа, таму што была аказаная аператыўная першая дапамога, мы абышліся без шрамаў. Адзіная рэкамендацыя, якую мы атрымалі падчас выпіскі, — не злоўжываць сонцам, не загараць, бо скура ў тых месцах, дзе быў апёк, і так атрымала моцны стрэс.

Зараз, хоць дачка ўжо вялікая і сама робіць чай, я ўсё адно па звычцы, машынальна, кубкі паварочваю ручкамі ад краю стала. І ўсім мамам і татам, асабліва маленькіх дзяцей, рэкамендую ўвесці гэта сабе ў звычку. Акрамя таго, вельмі важна, каб бацькі ведалі, як правільна аказаць дзецям у такіх сітуацыях першую медыцынскую дапамогу. Каб, калі, не дай бог, здарыцца бяда, не губляць каштоўныя секунды на пошукі інфармацыі».

Машын тата перакананы, што 99 % дзіцячых апёкаў можна прадухіліць. У якасці пацвярджэння гэтай думкі прывяду яшчэ некалькі гісторый са станоўчым зыходам.

Суседка распавядала, як яны на дачы палілі сухое лісце. Яе малодшы сын, ён тады хадзіў у дзіцячы садок, гуляў з палачкай каля таго вогнішча. У выніку моцна абпаліў далонь.

Жанчына папрасіла мужа памыць немаўля, пакуль яна прыгатуе вячэру. Перад тым, як апусціць малечу ў ванначку, мужчына забыўся праверыць тэмпературу вады... У выніку малеча атрымала апёкі...



У Расонскую бальніцу была шпіталізавана аднагадовая дзяўчынка. Яна знайшла бутэльку з растваральнікам і зрабіла некалькі глыткоў. Гэтага было дастаткова, каб атрымаць апёкі поласці рота і шыі. Бацькі выклікалі «хуткую», а самі паехалі на сваёй машыне насустрач медыкам, бо дача, дзе яны знаходзіліся ў момант няшчаснага выпадку, была за 20 кіламетраў ад райцэнтра.

28-гадовая жыхарка Ляхавіцкага раёна прасавала бялізну. У гэты час яе трохгадовая дачка схапілася за падключаны ў разетку провад, у выніку чаго атрымала ўдар токам. Дзіця было шпіталізавана.

У Жлобінскую райбальніцу паступіла дзіця, якому не споўнілася нават годзік. Урачы дыягнаставалі апёкі другой ступені. Прычына: прабабуля апаласнула дзіця «святой вадой», якую захоўвала ў бутэльцы з-пад воцату. Відавочна, яна не стэрылізавала тару, таму нават малой канцэнтрацыі воцатнай кіслаты хапіла, каб пашкодзіць далікатную скуру немаўляці.

### Што нельга рабіць пра апёках?

• Выкарыстоўваць ахалоджванне праточнай вадой пры апёках трэцяй і чацвёртай ступені. (Тут варта неадкладна выклікаць «хуткую». Можна даць абязбольвальны сродак.)

• Здымаць адзенне, калі яно прыліпла да скуры. У такім выпадку яго трэба абрэзаць па граніцы апёку.

• Праколваць пухіры.

• Дакранацца да пашкоджанай скуры рукамі.

• Прыкладваць да раны вату, лёд, пластыр.

• Апёкі ні ў якім разе нельга апрацоўваць алеем, а таксама сметанковым маслам, смятанай, вяршкамі, кефірам, яечным бялком, крэмамі, мазямі (выключэнне складае пантэнол, яго можна наносіць пасля ахаладжэння пры апёку першай і другой ступені), мачой, сыпучымі лекамі, прысыпкамі, растворамі ёду, зялёнкі, перакісам вадароду, спіртам.

### Як пазбегнуць бяды?

**Правілы на кухні:**

• падчас прыгатавання ежы не выпускайце малечу з поля зроку;

• гатуйце ежу толькі на далёкіх канфорках; пліта павінна быць надзейна зафіксаванай;

• посуд на пліце і стале павінен быць павернуты ручкамі да сцяны;

• не варта засцілаць абрусам стол, калі падаюцца гарачыя стравы;

• не стаўце на край стала ці пліты кубкі з гарачым чаем, талеркі і каструлі з супам, бо дзіця можа вывернуць гэта на сябе;

• не варта браць дзяцей на рукі пры прыёме гарачай ежы, бо малеча можа пацягнуць на сябе абрус ці схапіць той жа кубак з чаем;

• не пакідайце вісець шнуры электрачайнікаў, тостараў, пацягнуўшы за якія, дзіця можа атрымаць цяжкія апёкі.

**Правілы ў ванным пакоі:**

• не купайце нованароджаных у гарачай вадзе, памятайце: пры тэмпературы вады звыш 50 °С магчымы апёк;

• не пакідайце дзіця аднаго ў ванне: застаўшыся без нагляду, яно можа адкрыць кран з гарачай вадой і атрымаць апёк.

**А таксама...**

• Дзіця не павінна знаходзіцца паблізу адкрытага агню падчас прыгатавання шашлыку, спальванні смецця.

• Будзьце асцярожнымі пры карыстанні грэлкамі, памятайце, што скура дзіцяці больш далікатная, чым у дарослага.

• Стаўце ахоўныя прыстасаванні на электраразеткі.

• Не выкарыстоўвайце бутэлькі з-пад газіровкі для захоўвання небяспечных вадкасцяў.

• Захоўвайце ўсе небяспечныя вадкасці (воцат, растваральнікі) толькі ў бяспечных, закрытых на ключ месцах.

• Хавайце ад дзяцей запалкі, запальнічкі.

• Знаходзячыся ў гасцях у сваякоў, не пакідайце дзіця без нагляду, спадзеючыся на іншых. Калі ўбачылі, што штосьці можа быць небяспечным, не чакайце, калі здарыцца бяда, не спадзявайцеся на «авось», адразу ж прыбярыце рэч у недаступнае для малога месца.

Гэта толькі асобных здарэнні. І ва ўсіх названых выпадках няшчасця, сапраўды, можна было пазбегнуць. Але, як кажуць, каб ведаў, дзе ўпадзеш, дык саломкі пасцяліў бы...

**«Вельмі важна, каб бацькі ведалі, як правільна аказаць дзецям у такіх сітуацыях першую медыцынскую дапамогу. Каб, калі, не дай бог, здарыцца бяда, не губляць каштоўныя секунды на пошукі інфармацыі».**

### І НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕ КРЫЧАЦЬ!

У дзіцячым аддзяленні Рэспубліканскага апёкавага цэнтра пры бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Мінска штогод праходзяць лячэнне больш за тысячу пацыентаў з апёкамі. З іх ва ўзросце да 1 года — каля 15 %, ад 1 года да 3 — 50 %, ад 3 да 5 гадоў — 10 %, з 5 да 18 гадоў — 25 %. Найбольш частыя прычыны апёкаў — кантакт з гарачымі вадкасцямі і прадметамі, полымем, хімічнымі рэчывамі, электрычным токам. У медустанове пацвердзілі, што сапраўды большасць апёкаў у дзяцей можна прадухіліць. Для гэтага дастаткова проста добра за імі глядзець, праяўляць пільнасць і прадбачлівасць. У прыватнасці, усе бацькі без выключэння павінны ведаць, што ў дашкольнікаў асноўная прычына апёкаў — кантакт з гарачымі вадкасцямі (месцам атрымання часцей за ўсё бывае кухня ці ванны пакой), а таксама гарачымі прадметамі (прас, грыль, мангал, попел...).

Апёк у дзіцяці — заўсёды стрэсавая сітуацыя для бацькоў. Але медыкі настойліва раяць узяць сябе ў рукі і пастарацца не панікаваць. Аператыўна акажыце першую дапамогу і супакойце дзіця. Ні ў якім разе нельга на яго крычаць. Маўляў, я ж табе казала... У дзіцяці і так стрэс, а вы сваёй неадэкватнай рэакцыяй толькі яго ўзмоцніце.

Што датычыцца першай дапамогі, то пры апёках гарачымі вадкасцямі неабходна вельмі асцярожна зняць адзенне з пацярпелага ўчастка. Калі гэтага не зрабіць, глыбіня апёкаў будзе большая. Калі скура засталася цэласнай (гэта першая і другая ступень апёку), змясціце траўмаваны ўчастак пад струмень праточнай халоднай водаправоднай вады (але не ледзяной!) на 15—20 хвілін (не пазней, чым праз 2 гадзіны пасля атрымання апёку). Аптымальная тэмпература вады 12—18 °С. Пасля гэтага трэба накласці стэрыльную павязку.

Першая дапамога пры апёках полымем — патушыць, максімальна хутка зняць адзенне, якое гарыць, эвакуіраваць пацярпелага з зоны павышанай тэмпературы ці задымлення на свежае паветра. Пры хімічных апёках — шчодра прамыць рану вадой (не менш за 20—30 хвілін), пры гэтым неабходна быць асцярожнымі, карыстацца пальчаткамі і ахоўным адзеннем, каб не атрымаць пашкоджанні самім. Пры электратраўме — вызваліць пацярпелага ад дзеяння току (вырваць з рук аголены провад, адцягнуць цела на бяспечную адлегласць), пры гэтым абавязкова трэба выкарыстоўваць ахоўныя сродкі (гумавыя пальчаткі і абутак). На апёкавую паверхню неабходна накласці стэрыльную павязку ці загарнуць дзіця ў чыстую адпрасаваную прасціну. Медыкі раяць ні ў якім разе не займацца самалячэннем, абавязкова звярнуцца ў паліклініку ці бальніцу, а пры вялікім пашкоджанні неадкладна выклікаць хуткую дапамогу.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

# «У дэкрэце я была тры месяцы»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Што было спачатку: сям'я ці «Хвілінка»?***

**Таццяна ПАНОВА (Т. П.)**: — Сям'я, хоць «Хвілінка» — таксама наша сям'я. Мы з Жэнем разам вучыліся ў музычным вучылішчы, наш курс быў вельмі дружны. Пасля заканчэння вучылішча Жэню прызвалі на службу ў войска, а я паступіла ва ўніверсітэт культуры. У гэты перыяд мы выпалі з поля зроку адно аднаго.

**Яўген ФАМБАРАЎ (Я. Ф.)**: — Пасля вяртання з войска я таксама паступіў ва ўніверсітэт культуры. Ведаў, што многія сябры па музвучылішчы ўжо там. З Таняй аднавілася знаёмства, калі мы выпадкова апынуліся ў адным ліфце і паспелі абмяняцца тэлефонамі.

**Т. П.:** — У нас былі агульныя сябры, інтарэсы, аказалася, што і жывём па суседстве. Як пара мы сустракаліся ўсяго тры месяцы, і неяк само сабой вырашылася, што ствараем сям'ю.

***— Звычайна студэнты творчых ВНУ выступаюць на чужых вяселлях, каб зарабіць на сваё. А вы паспелі?***

**Т. П.:** — Не, не паспелі, увесь час ішоў на вучобу. Вяселле нам спраўлялі бацькі, за гэта ім вялікі дзякуй. Мы лічым, што вяселле — вельмі асабістае свята, на якое запрашаюцца толькі самыя блізкія людзі, таму не вельмі фінансава абцяжарылі бацькоў. А вось музыканты, якія працавалі ў кафэ, у той вечар адпачывалі, бо выступалі нашы сябры.

***— А як далей уладкоўвалі жыццё? Перавяліся на завочнае аддзяленне?***

**Я. Ф.:** — Таня ішла на чырвоны дыплом, а маёй спецыяльнасці — «Музыкант-духавік» — завочна наўрад ці па-сапраўднаму навучышся, таму мы засталіся на дзённым. Паўтару ўслед за Таняй: дзякуй нашым бацькам. Канешне, яны дапамагалі, пакуль мы вучыліся.



Яраслаў — гонар бацькоў.

***— А дзе вы жылі?***

**Я. Ф.:** — У Танінай мамы, і паранейшаму жывём усе разам. Мая цешча Раіса Міхайлаўна — вельмі тактоўная, разумная жанчына, ні разу ў жыцці не адчуваў сябе ў яе доме, як кажуць, у «прымах». Мы з ёй нават змовы супраць Тані ладзілі...

***— А вось пра гэта падрабязней, калі ласка...***

**Я. Ф.:** — Нашаму сыну Яраславу было тры месяцы, калі Таня з «Хвілінкай» з'ехала на конкурс у Магілёў. Сын захварэў, высокая тэмпература... Таня тэлефануе, пытаецца, як дзіця. Мы вырашылі, што нічога не гаворым, самі спраўімся. Навошта яе хваляваць, калі на адлегласці яна нічым не можа дапамагчы?



Вяселле.

**Т. П.:** — З таго конкурсу мы прыехалі ў званні лаўрэатаў. Там я пазнаёмілася з кампазітарам Алегам Елісеенкавым. Ён, калі даведаўся, што я — маладая мама, якая корміць дзіця, сказаў: «Вы вар'ятка, прыязджайце да мяне па песні, будзе вам падарунак». З таго часу ён дорыць нам цудоўныя дзіцячыя песні.

***— Вы планавалі нараджэнне дзіцяці?***

**Т. П.:** — Так, прычым, вельмі свядома. Перш трэба было стаць на ногі як у прафесійным сэнсе, так і цалкам самастойна забяспечваць сям'ю. Пасля заканчэння ўніверсітэта мне прапаноўвалі аспірантуру, можна было застацца і ў 1-й музычнай школе Мінска, дзе праходзіла практыку. Усё гэта было вельмі зручна, але мне так хацелася свой калектыў! Адным з пунктаў размеркавання была 194-я школа з эстэтычным ухілам у мікрараёне Сокал. Па тым часе — далекавата, рэйсавым аўтобусам трэба было дабірацца. Але там працаваў такі класны дырэктар! У мяне стварылася вялікая нагрузка: спевы, малодшы школьны хор, вакальная група, факультатыў па эстэтыцы і пры гэтым — неверагодная творчая свабода. Вось адтуль адлічвае «Хвілінка» свае 30 гадоў!

Сын, любімы і доўгачаканы, з'явіўся, як мы і планавалі, праз пяць гадоў пасля вяселля. Мая мама жартавала: «Таня ў радзільным доме, а па тэлевізары паказваюць яе дзяцей».

***— Кажуць, што ў дэкрэт вы і не сыходзілі. Запрасілі няню ці бабулі дапамагалі?***

**Т. П.:** — У дэкрэце я была тры месяцы. Як маладой маме мне вельмі пашанцавала! Па-першае, Жэня — выдатны муж і бацька, дзякуючы якому я не ведала, што такое ўставаць па начах да дзіцяці. Па-другое, нашы творчыя прафесіі, а мая маці таксама педагог па музыцы, дазволілі складаць графік работы так, што з Яраславам хтосьці ўвесь час быў, часцей за ўсё мая мама. А з трох гадоў сын ужо займаўся ў «Хвілінцы».

***— Яўген, а вы не раўнавалі жонку да працы?***

Я. Ф.: — Было крыху... Сустракаў яе са школы, часта ехалі апошнім аўтобусам... Але я разумеў, як Тані цікава і важна тое, што яна робіць. І ёй удаецца сумяшчаць кар'еру і сям'ю, яе хапае на ўсё!

**Т. П.:** — Так, усё цесна пераплялося: адно немагчыма без другога. У нейкі момант прыйшло разуменне, што для далейшага развіцця «Хвілінцы» патрэбная ў тым ліку юрыдычная самастойнасць. А каму даверыць пячатку, бухгалтэрыю? На 100 % я магла даверыцца толькі мужу. Таму і папрасіла Яўгена стаць дырэктарам калектыву.

**Я. Ф.:** — Мне падабалася мая праца ў аркестры ўнутраных войскаў. Але я цудоўна разумеў, што Тані патрэбна дапамога. Падумаў, раз спраўляюся з сямейнай бухгалтэрыяй, атрымаецца і тут. Да таго ж, я ўдзельнічаю і ў творчым працэсе, таму няма такога адчування, што я як музыкант наступіў на горла ўласнай песні.

***— У вас шмат зносін з бацькамі дзяцей, напэўна, даводзіцца сутыкацца з іх завышанымі патрабаваннямі і да вас, і да дзяцей?***

**Я. Ф.:** — У нас ёсць дакладныя правілы, і мы адразу знаёмім з імі бацькоў. Першае, аб чым папярэджваем: мы не прадзюсарскі цэнтр і не ствараем «зорак». Мне заўсёды няёмка, калі бацькі кажуць: маўляў, аддаў сваё дзіця на музыку. Што значыць аддаў? Адразу тлумачым, што тут яны будуць займацца, мець зносіны, гэта значыць, прыкладаць свае намаганні. Прынцып просты: лепш мы менш заробім, але будзем сумленныя перад сабой і бацькамі.

Калі мы працуем з новымі рэжысёрска-пастановачнымі групамі, яны звычайна пытаюцца, колькі будзе дзяцей і бацькоў за кулісамі. І некаторых здзіўляе мой адказ: напрыклад, дзесяць дзяцей і адзін педагог. У нас катэгарычна не прынята, каб за кулісы з дзіцем прабіралася пяцёра дарослых і там яны спаборнічалі, хто лепш завяжа бант. Дзякуючы педагогам нашы дзеці дысцыплінаваныя, самастойныя, упэўненыя ў сабе, у іх развіта пачуццё каманды.

**Т. П.:** — Задача бацькоў — купіць квіткі на канцэрт і падтрымаць дзяцей апладысментамі. Ведаеце, мы навучаем, развіваем не толькі дзяцей, але і бацькоў. Апошні выпадак: зборны канцэрт, сярод салістаў — Уладзімір Громаў. Дзве мамы нашых вучняў пасля канцэрта пытаюцца ў мяне, дзе яшчэ можна яго паслухаць. Кажу, што ў оперным тэатры. А далей мне зразумела: прыйдуць у тэатр, паслухаюць Громава, а потым іх зацікавяць іншыя салісты, і ўсё — людзі далучаюцца да опернага мастацтва.



Раіса Міхайлаўна Панова — любімая мама, цешча і бабуля.



Таццяна Панова з мужам і сынам.

**Я. Ф.:** — Ведаеце, я перакананы, што дзяцінства павінна быць шчаслівым. Для гэтага патрэбна любоў бацькоў і пачуццё паспяховасці ў дзіцяці. А яно з'яўляецца тады, калі малое робіць тое, што атрымліваецца. Бацькам важна зразумець, што цікава, да чаго дзіця імкнецца, даць яму волю. Наш сын, дарэчы, не хацеў наведваць музычную школу з першага класа. Мы яго не прымушалі. А ў пятым ён сам вырашыў навучыцца іграць на гітары, сам знайшоў, дзе займацца. Цяпер гэты досвед дапамагае яму ў працы.

***— Раскажыце пра вашага сына... Ці працягвае ён творчую дынастыю?***

**Т. П.:** — Яраслаў — гэта наш гонар! А я — вельмі аб'ектыўная мама. Здольнасці сына ацэньвала як прафесіянал, таму не дапускала яго спяваць у канцэртах, бо былі дзеці, у якіх гэта лепш атрымлівалася. Але неяк, нават нечакана для нас, ён аказаўся выдатным вядучым канцэртаў, у яго проста вось такая прафесійная дыктарская манера была. Яму падабалася журналістыка, ён публікаваўся ў «Зорьке», быў вядучым дзіцячай рубрыкі ў праграме «Наша раніца», карэспандэнтам на «Еўрабачанні». Мы былі ўпэўненыя, што сын паступіць на журфак, але ён абраў прафесію гукарэжысёра. У свае 26 гадоў Яраслаў дасягнуў прафесійных поспехаў, яму давяраюць агучваць самыя прэстыжныя канцэрты. Вельмі ганарымся, што сын усяго дабіўся сам. «Чаму мама не сказала, што ты яе сын?» — пытаўся неяк у Яраслава кіраўнік вакальнай групы «Беларусы» Валерый Шмат. А для мяне важна, каб Яраслаў атрымліваў высокую адзнаку як прафесіянал, а не як мой сын.

***— Гэта значыць, у адносінах да сына ў вас перамагае прафесіянал?***

**Т. П.:** — Перш за ўсё я мама, якая вельмі любіць сына, але цвярозай любоўю. Гэтаму я навучылася ў сваёй мамы. Заўсёды адчувала сябе любімым дзіцем, але патрабавальнасць таксама прысутнічала. Больш за ўсё мяне песціў дзядуля. Мама паважала мае дзіцячыя інтарэсы. З мамай нам падабалася хадзіць на канцэрты ў філармонію. Гэта такія цёплыя ўспаміны. Вельмі рада, што мая мама таксама ў «Хвілінцы» — яна выкладае вакал у малодшай групе.

**Я. Ф.:** — І робіць гэта цудоўна. Раіса Міхайлаўна праводзіць заняткі ў гульнявой форме, каб дзецям было камфортна і зразумела.

***— Як вы праводзіце водпуск?***

**Т. П.:** — Цяжкае пытанне. У чыстым выглядзе водпуск у нас добра, калі тыдзень. А традыцыйна мы адпраўляліся з калектывам на фестывалі, конкурсы. Атрымлівалася і падарожнічаць, і паглядзець іншыя краіны. Цікава ўбачыць іншыя дзіцячыя творчыя калектывы і сябе паказаць. У нас цудоўныя дзеці, добры рэпертуар, створаны менавіта для іх, таму заўсёды паспяхова выступаем.

***— Ці гатовыя вы да з'яўлення ўнукаў?***

**Т. П.:** — Мы, можа, і гатовыя, але ад нас гэта ніяк не залежыць. Мы не з тых бацькоў, якія ўвесь час пытаюцца: калі ажэнішся? Калі Яраслаў з намі нечым дзеліцца, мы рады, але самі парад не даём. Як калісьці мае і мужавы бацькі бачылі ў нас асоб, паважалі наш выбар, так і мы зараз ставімся да свайго сына.

**Маргарыта ДРАЗДОВА, фота з сямейнага архіва Таццяны Пановай і Яўгена Фамбарава.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ПМК № 187»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Грузовой специальный автобетоносмеситель МАЗ 5337 А28, 2008 г. в., 4 куб. м, дизель, мкпп, цвет белый, № кузова, шасси Y3M5337A280000472, пробег 166 т. км | 18 480,00 | 1 848,00 | 924,00 |
| 2 | Грузовой бортовой MAZ 6303 A5, 2008 г. в., дизель, мкпп, цвет белый, № кузова, шасси Y3M6303A590001003, пробег 313 т. км. Разрешенная масса 24500 кг. Масса без нагрузки – 11200 кг | 30 600,00 | 3 060,00 | 1 530,00 |
| 3 | Седельный тягач МАЗ 5440 А5, 2008 г. в., дизель, мкпп, цвет белый, № кузова, шасси Y3M5440A580000162, пробег 280 т. км. Разрешенная масса18450 кг. Масса без нагрузки 7800 кг | 15 480,00 | 1 548,00 | 774,00 |
| 4 | Экскаватор ЕК-14-20, 2009 г. в., двигатель Д-245, дизель, мкпп, з.н. 3996, цвет желтый, пробег 3,6 т. км | 36 840,00 | 3 684,00 | 1 842,00 |
| 5 | Ножницы гильотинные с наклонным ножом СТД9АН | 17 712,00 | 1 771,20 | 885,60 |
| 6 | 1. Системный блок AMD 1,93 Ггц ОЗУ 512 Мб HDD 512 Гб DVD. 2. Системный блок AMD Athlon 2 2,7 Ггц ОЗУ 1 Гб HDD 80 Гб DVD. 3. Системный блок Pentium Dual 2,5 Ггц ОЗУ 2 Гб HDD 150 Гб DVD. 4. Системный блок Pentium Dual 2,5 Ггц ОЗУ 1,93 Гб HDD 320 Гб CD R. 5. Системный блок AMD Athlon 2 2,7 Ггц ОЗУ 1 Гб HDD 250 Гб, DVD. 6. Монитор FLATRON L1718S-SN. 7. Монитор FLATRON L1719S. 8. Монитор FLATRON L1742S; 9. Монитор FLATRON L1750U; 10. Монитор FLATRON L1751SQ. 11. Монитор FLATRON L1750SQ. 12. Принтер XEROX PHASER 3117. 13. Принтер XEROX PHASER 3117. 14. Принтер XEROX PHASER 3117. 15. Принтер SAMSUNG ML2010PR. 16. Принтер XEROX PHASER 3122 | 1 111,84 | 111,18 | 55,59 |
| 7 | 1. Мини-АТС, aria soho Digital Hybrid PABXforZOHO. 2. Набор мебели «Виктория Люкс 5». 3. Устройство термопереплета UNIBIND XU 138. 4. Факсимильный аппарат Panasonic KX-FT 982RU. 5. Антенна СА-600, цифровой спутниковый ресивер GS 7300 | 822,00 | 82,20 | 41,10 |
| 8 | 1. Подмости инвен. Шарн.-панельн. ПШ-000 А (с настилом). 2. Сейф металлический. 3. Шкаф металлический для документов. 4. Шкаф металлический для одежды. 5. Бетоносмеситель, BWE 250K. 6. Бункер БП – 1,0 | 3 363,24 | 336,32 | 168,16 |
| 9 | Отделочная станция 2М359 | 4 664,40 | 466,44 | 233,22 |
| 10 | Контейнер металлич. М-К2-2-15 | 2 205,60 | 220,56 | 110,28 |
| 11 | Вагон-дом | 609,60 | 60,96 | 30,48 |
| 12 | Вагон-бытовка строительная на колесах | 794,40 | 79,44 | 39,72 |
| 13 | Вагон-бытовка строительная | 609,60 | 60,96 | 30,48 |
| 14 | Станок ПРО-10 (правильно-отрезной станок) | 1 951,01 | 195,10 | 97,55 |
| 15 | Станок профилегибочный МГ-0080-П-М | 2 194,88 | 219,49 | 109,74 |
| 16 | Станок токарно-винторезный 1К62 | 3 061,32 | 306,13 | 153,07 |
| 17 | Установка пуско-зарядная ENERGY1000 START 230-400 | 1 184,10 | 118,41 | 59,21 |
| 18 | 1. Захват 6 м. 2. Захват ГУИЛ.484135.009-001 | 3 280,01 | 328,00 | 164,00 |

В отношении лотов №№ 1–18 проводятся первые торги

**Местонахождение лотов №№ 1–11, 13–18:** Минская область, г. Молодечно, ул. Т. Дудко, д. 10.
**Местонахождение лота № 12:** Минская обл., г. Молодечно, ул. Нагорная, д. 5

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **28 апреля 2023 года в 12.00 (регистрация – с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **с 10.00 23 марта 2023 года до 16.00 26 апреля 2023 года** |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту __, ОАО «ПМК № 187», проводимых 28.04.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи.
Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления являются дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Сергей Владимирович, +375296109357.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Передвижная механизированная колонна № 187», в лице ликвидатора – ООО «КАНО», тел.: 80173958917; +375293928906 (222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 10)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ

## Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП»

31 марта 2023 г. в 10.00 проводит повторные торги по продаже следующего имущества

| № п/п | Наименование объекта продажи | Описание | Начальная цена продажи снижена на 80 % и составляет с учетом НДС 20 %, белорусских рублей | Задаток, белорусских рублей |
|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | Капитальное строение с инвентарным номером 713/С-8973 | Общая площадь – 496,2 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание паровозно-тракторного депо, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кличевский р-н, Гончанский с/с, п. Гончанский, ул. Заводская, 2 | 5928,00 (Пять тысяч девятьсот двадцать восемь рублей 00 копеек), в т. ч. НДС 20 % – 988,00 (Девятьсот восемьдесят восемь рублей 00 копеек) | 592,80 (Пятьсот девяносто два рубля 80 копеек) |
| **Лот № 2** | Капитальное строение с инвентарным номером 713/С-8957 | Общая площадь – 91,6 кв. м, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газораспределительные станции), наименование – здание мастерской, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кличевский р-н, Гончанский с/с, п. Гончанский, ул. Заводская, 2 | 1680,00 (Одна тысяча шестьсот восемьдесят рублей 00 копейки), в т. ч. НДС 20 % – 280,00 (Двести восемьдесят рублей 00 копеек) | 168,00 (Сто шестьдесят восемь рублей 00 копеек) |
| **Лот № 3** | Капитальное строение с инвентарным номером 713/С-8961 | Общая площадь – 259,3 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание материального склада, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кличевский р-н, Потокский с/с, п. Гончанский, ул. Заводская, 2 | 2880,00 (Две тысячи восемьсот восемьдесят рублей 00 копейки), в т. ч. НДС 20 % – 480,00 (Четыреста восемьдесят рублей 00 копеек) | 288,00 (Двести восемьдесят восемь рублей 00 копеек) |

**Собственник имущества:** ОАО «Торфопредприятие Днепровское», 213332, д. Годылево, Быховский р-н, Могилевская обл., ул. Гасана, 12, УНП 700083371, тел. для осмотра объектов продажи +375336438989 – Ашурова Рано Олимовна.

**Организатор торгов:** Унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1,

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лоты №№ 1, 2, 3 продаются без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, представившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет унитарного предприятия «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY55PJCB30123018571000000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, BIC: PJCBBY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

**Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет-сайте продавца по адресу: www.mogilev.cci.by.**

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты за предметы торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

**Торги состоятся в 31 марта 2023 г. в 10.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».**

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104. Последний срок подачи заявления – 30 марта 2023 г. до 12.00.

Регистрация участников торгов 31 марта 2023 г. с 09.30 до 10.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 104, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: (0222) 778032, +375 33 607 08 05 (А1) – Жилина Ольга Александровна.

Извещения о предыдущих торгах по объектам были размещены в газете «Звязда» от 04.01.2023 г., 22.02.2023 г.

БЕЛАРУСБАНК

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта** | **Изолированное помещение № 130/D-60053** |
| **Месторасположение объекта** | г. Пинск, ул. Альбрехтовская, 4-103 |
| **Продавец объекта** | ОАО «АСБ Беларусбанк» |
| **Организатор торгов** | Брестское ОУ № 100 ОАО «АСБ Беларусбанк» |
| **Площадь** | 218,9 кв. м |
| **Начальная цена продажи с учетом НДС** | 84 600,00 руб. (восемьдесят четыре тыс. шестьсот руб. 00 коп.) |
| **Сумма задатка** | 9 000,00 руб. (девять тыс. руб. 00 коп.) |
| **Информация о земельном участке** | Земельный участок с кадастровым № 144500000015000091, с площадью 0,3531 га |
| **Характеристика объекта** | Стены – кирпичные, перекрытие – железобетонные плиты; кровля – рулонная; полы – бетонные мозаичные, плитка ГРЭС; окна – деревянные, стеклопакеты ПВХ; двери – ПВХ, металлические, ДВП; внутренняя отделка – обои, штукатурка с покраской; отопление, холодное водоснабжение и канализация – централизованная система; вентиляция – естественная |
| **Условия оплаты** | По договоренности победителя торгов с собственником имущества |

**Торги состоятся 10 мая 2023 года в 10.00 по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, актовый зал на 9-м этаже.**

**Документы для участия принимаются по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, каб. 409 до 4 мая 2023 года.**

Для участия в торгах к моменту подачи документов необходимо внести задаток на р/с **BY69AKBB66708597000020000000**, ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНН 100325912.

Если на участие в торгах подана только одна заявка, то объект продается этому участнику (с его согласия) по начальной цене, увеличенной на 5 %. Договор купли-продажи заключается в течение 40 рабочих дней с даты проведения торгов.

Тел./факс (80162) 277518.

Обязательным условием аукциона является заключение победителем торгов либо единственным участником, изъявившим готовность приобрести реализуемое изолированное помещение, договора по приобретению имущества (основные средства: водомерный узел) общей стоимостью 53,71 руб. (пятьдесят три руб. 71 коп.) с учетом НДС, предназначенного для эксплуатации отчуждаемого объекта недвижимости.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором торгов с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения торгов.

Торги проводятся путем пошагового увеличения цены. Шаг торгов – 5 % от предыдущей названной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем торгов возмещаются затраты на организацию и проведение торгов в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. Затраты по оформлению правоустанавливающих документов несет покупатель.

Договор купли-продажи по результатам проведения торгов должен быть подписан в течение 40 рабочих дней со дня проведения торгов.

## ООО «СпецРеализация»

**объявляет о проведении первых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «Профиарч»,**

(УНП 101099301, Минская область, Минский район, Щомыслицкий сельсовет, д. 16, оф. 12),

**находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)**

***Дата и время проведения торгов*: 07 апреля 2023 года**.

Начало – 10.00. Заявки принимаются с 23 марта 2023 года по 05 апреля 2023 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «Профиарч», (УНП 101099301)** в лице антикризисного управляющего – директора Частного предприятия «ЮрЛиния» Павловской В.Н.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 255 (29877) за 28.12.2022.

Двое — гэта занадта?

# ДАВАЙ РАЗВЯДЗЁМСЯ!..

## Чаму людзі разыходзяцца і як можна захаваць сям'ю?

**З дзяцінства мы чытаем кнігі, у якіх каханне і шлюб паміж героямі — гэта адзін раз і назаўжды. Аднак рэчаіснасць больш жорсткая і з цягам часу ў такія гісторыі верыцца ўсё менш.**

Даследчыкі пішуць, што часцей за ўсё пары разводзяцца на 6—9-м годзе шлюбу, а самы «папулярны» ўзрост для разводу — 30—34 гады. Але калі прычынай разводу пасля першых пяці гадоў шлюбу можна назваць банальную «не сышліся характарамі», то чым можна «не сысціся», пражыўшы разам 20, 30 гадоў? Разабрацца ў прычынах і шляхах вырашэння крызісных сітуацый нам дапамагалі практыкуючыя сямейныя псіхолагі са шматгадовым стажам Таша і Сяргей ПЯТРОВЫ.

### Не назапашваць крыўды

— Сярод самых частых прычын распаду шлюбаў — назапашаныя гадамі крыўды, расчараванне ў партнёры, здрады, рознае ўяўленне пра шлюб і сямейнае жыццё, розны сексуальны тэмперамент, немагчымасць дараваць.

Развод спецыялістам успрымаецца як крызісная сітуацыя ў адносінах, з якой пара павінна выйсці. І выйсце гэта ва ўсіх будзе сваё. З нашай практыкі можна сказаць, што развод хутчэй залежыць не ад таго, колькі гадоў людзі жывуць разам, а ад іх здольнасці праходзіць праз гэты самы крызіс. Рызыка разрыву шлюбу ёсць заўсёды, і мы такія прыклады бачым на любых тэрмінах. У пытаннях разводаў немагчыма разважаць катэгорыямі «добра — дрэнна», «правільна — няправільна». На прафесійнай мове жаданне чалавека завяршыць адносіны азначае тое, што ў яго мала навыкаў пабудовы здаровых стасункаў; мала або зусім



адсутнічае разуменне таго, што такое адносіны ў прынцыпе. Так бывае, калі няма прыкладу бацькоўскага паразумення ў сем'ях, няма на што абапірацца.

Каб не даходзіць з партнёрам да цяжкіх сітуацый, калі вырашэнне канфлікту ўжо значна ўскладняецца, трэба сачыць за адносінамі, адзначаць змены. «Званочкамі» аб праблемах паміж людзьмі могуць з'яўляцца: памяншэнне часу на зносіны, пазбяганне адно аднаго, павелічэнне дыстанцыі паміж партнёрамі, памяншэнне кропак судатыкнення, хранічная незадаволенасць аднаго з партнёраў або адразу абодвух, павелічэнне адмоўных эмоцый. Самае першае і галоўнае, што трэба рабіць, — гэта размаўляць, выказваць свае пачуцці і жаданні, не назапашваць крыўды.

### А як жа дзеці?

— У нашых рэаліях даволі часта сустракаюцца сітуацыі, калі людзі застаюцца ў шлюбе дзеля дзяцей і доўгія гады «адыгрываюць» паўнацэнную сям'ю. Канкрэтна тут нельга сказаць, ці будзе менавіта такі спосаб больш траўматычны для дзіцяці. Для кожнай сям'і ўсё вельмі індывідуальна. Але некаторыя фактары ў любым выпадку складана будзе хаваць. У апісанай сітуацыі дзеці могуць атрымліваць шкодныя двайныя пасланні. Яны могуць адчуваць, што нешта не так, але праз свой узрост не разумець. Часцей за ўсё дзеці ў такіх абставінах усё ж не атрымаюць досвед шчырых, цёплых сямейных адносін, любові. Аднак нашчадкі заўсёды вучацца на нашых прыкладах. Калі мы жадаем ім такога ж шлюбу ў будучыні, то можна ўсё пакінуць без зменненняў. Калі ж мы хочам навучыць іх шчасліваму сямейнаму жыццю, то ў першую чаргу трэба імкнуцца быць шчаслівымі самім.

Калі з разводам усё ўжо вырашана, то бацькі самастойна могуць паспрабаваць мінімізаваць яго наступствы для дзіцяці. І для гэтага трэба з ім размаўляць. Казаць пра тое, што адбываецца, на зразумелай для яго мове. Напрыклад, калі дзіцяці гадоў 4-5, бацькі скажуць, што яны «не сышліся характарамі», малое нічога не зразумее. Лепш, калі бацькі сфармулююць гэта інакш, напрыклад: «Мама і тата больш не хочуць жыць разам. У дарослых так бывае. Але мы заўсёды будзем тваімі бацькамі, будзем цябе любіць». Трэба падбіраць простыя словы, перадаючы змест, але не паглыбляючыся ў падрабязнасці. Бывае, што бацькі, калі дзеці становяцца крыху старэйшыя, адкрываюць ім інтымныя дэталі сваіх адносін. Рабіць гэта нельга ні ў якім выпадку! Кожнаму з партнёраў важна захаваць для дзіцяці станоўчы вобраз бацькі або маці. Трэба тлумачыць дзецям, што, нягледзячы на развод, мама і тата добрыя, яны цябе любяць, але каханне паміж імі ўжо мінула.

### Псіхолаг вам у дапамогу

— Апошнім часам колькасць зваротаў да сямейных псіхолагаў павялічылася, але ўсё роўна іх не так шмат. Часцей прыходзяць пары, калі адзін з партнёраў хоча захаваць адносіны, а другі сумняваецца або хоча ўсё закончыць. Гэта адзін з самых цяжкіх сцэнарыяў для працы. Тут узнікае жаданне і аднаго падтрымаць у намеры захаваць шлюб, і іншага — яго выбар важна пачуць і не ціснуць. Спачуваеш абодвум, але любое выйсце тут кагосьці аднаго не задаволіць. Можна толькі дапамагчы партнёрам данесці адно аднаму сваю пазіцыю. Гэта хутчэй разавая сустрэча. Далей можна аднаўляць работу, калі ў партнёраў з'явіцца агульны запыт — ці на экалагічнае расстанне ці на спробу захаваць кантакты. Сустракаюцца выпадкі, калі адносіны паміж людзьмі ўжо завершаны, але яны хочуць наладзіць камунікацыю, каб спакойна мець зносіны дзеля дзяцей, і таму звяртаюцца да нас.

Спецыяліст, як ужо згадвалася раней, дапаможа выявіць прычыну крызісу шлюбу, асэнсаваць яго і ўсвядоміць. Для пары такая праца дасць магчымасць перажыць цяжкую сітуацыю максімальна спакойна і знайсці спосабы выхаду, перабудаваўшы свае адносіны.

У любым выпадку, мы раім звяртацца да спецыялістаў. Гэта павялічвае шанцы на станоўчае вырашэнне сітуацыі. У выпадку адсутнасці такой магчымасці самае першае і самае галоўнае — размаўляць. Дзяліцца пачуццямі, думкамі, чаканнямі ад адносін і тым, што не атрымліваецца ў іх. Не баяцца злосці.

Нават калі ўсё ўжо вырашана, памятайце, што развод — гэта проста яшчэ адзін этап у вашым жыцці, а не яго канец. Кожны з нас адзіны ў самога сябе, і кожны заслугоўвае жыць шчасліва.

**Марыя ТАРНАЛІЦКАЯ.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

П А К А Ш Т У Й Ц Е !

## КАТЛЕТЫ З АЎСЯНЫХ ШМАТКОЎ



***Ідэальны варыянт для посту. Яны падыдуць да любога гарніру, няхай гэта будуць крупы ці салаты.***

***Спатрэбіцца:*** *аўсяныя шматкі — 200 г.; соль — 1 ч. л.; кіпень — 200 мл; часнок — 3 зубкі; бульба — 250 г; цыбуля — 1 шт.*

Кіпенем заліваем аўсяныя шматкі і даём набракнуць. Гэта адбываецца на працягу 15-30 хвілін у залежнасці ад шматкоў. Цыбулю і часнок кладзём у блэндар і здрабняем да стану кашы. Бульбу чысцім ад лупіны і надзіраем на дробнай тарцы. Да набраклых шматкоў дадаём цыбульную кашу, надзёртую бульбу. Солім сумесь і змешваем да аднастайнай масы. Пакідаем на 10 хвілін. Разаграваем на патэльні алей.

Фарміруем з сумесі катлеты і смажым на сярэднім агні. З кожнага боку катлеты смажацца прыкладна 5 хвілін.

## ВЕГЕТАРЫЯНСКІЯ ГАЛУБЦЫ



***Спатрэбіцца:*** *капусныя лісты — 12 шт.; бульба — 400 г; грыбы — 300 г; цыбуля — 1 шт.; морква — 1 шт.; таматная паста — 1 ст. л.; лаўровы ліст — 2 шт.; чорны перац гарошынкамі — 5 шт.; соль — на смак; алей для абсмажвання, крыху зялёнівы кропу.*

У капусных лістоў зрэзаць грубыя прожылкі, пакласці на некалькі хвілін у кіпень. Дастаць і пакінуць на талерцы. Бульбу адварыць у падсоленай вадзе. Пасля гатоўнасці зліць ваду, расцерці бульбу ў пюрэ. Моркву надзерці на тарцы, парэзаць цыбулю і грыбы. Усё вылажыць на патэльню, абсмажыць да гатоўнасці. Грыбную сумесь дадаць да бульбянога пюрэ, старанна змяшаць.

З астылых лістоў скруціць галубцы з начынкай з бульбяна-грыбной сумессю. Абсмажыць іх на патэльні з алеем з двух бакоў. Галубцы вылажыць у рондаль. У ваду ад капуснага лісця дадаць таматную пасту, крыху солі. Заліць галубцы, каб вадкасць трохі прыкрывала, дадаць лаўровы ліст і чорны перац гарошынкамі. Тушыць на слабым агні на працягу 20-25 хвілін. У канцы прысыпаць здробненым кропам.

## СЕЛЯДЗЕЦ ПА-ГАЛАНДСКУ



***Спатрэбіцца:*** *селядзец свежамарожаны — 2 шт., цыбуля — 2 шт., лімон — 0,5 шт., цукар — 3 ч. л., соль — 6 ч. л., морква — 1 шт., лаўровы ліст — 10-12 шт., чорны перац — 8-10 гарошын буйна памолатых.*

Лімон наразаем тонкімі кружочкамі. Моркву надзіраем на буйной тарцы. Цыбулю наразаем кольцамі. Змешваем цукар, соль і перац. Выкладваем пластамі ў слоік: на дно — некалькі колцаў цыбулі, лаўровы ліст, крыху морквы, кавалачак лімона, трошкі сумесі цукру, перцу і солі. Зверху — пласт селядца. Затым зноў гародніна і спецыі.

І так чаргуем пластамі, перыядычна прыціскаючы, пакуль не дабяромся да самага верху слоіка. Потым закрываем шчыльным вечкам і адпраўляем у халадзільнік. На другі-трэці дзень селядзец гатовы. Прыгатаваны такім чынам селядзец атрымліваецца далікатны, сакавіты і вельмі смачны. Пры падачы можна паліць алеем.

У М Е Л Ы Я   Р У Ч К І

## МОДНЫЯ І ЗРУЧНЫЯ ШАРАВАРЫ

### Хоць на вуліцу, хоць для дому



***Нездарма штанам, якія мы ведаем як шаравары, шмат сотняў гадоў. Свабодны крой не абмяжоўвае рухі, выглядае экзатычна і модна. Такая мадэль будзе актуальная як у якасці хатняга адзення, так і для выхадаў на вуліцу.***

***Спатрэбіцца:*** *кавалак асноўнай тканіны (перавагу варта аддаць тонкім струменістым) 110 на 150 см (памер адзін, але для вельмі аб'ёмных фігур лепш узяць тканіны*



*больш) і чатыры кавалачкі 21 на 19 см любой іншай тканіны для кішэняў.*

Для раскрою складзіце асноўную тканіну напалам па доўгім боку — атрымаецца прамавугольнік 110 на 75 см. Кароткі бок падзяліце напалам (па 37,5 см) і пастаўце пазнаку. Перпендыкулярна зрэзу тканіны адкладзіце ад гэтай пазнакі 45 см. А на процілеглым баку ад кутоў па зрэзе адкладзіце па 22 см. Разрэжце тканіну па згіне. Апошнія тры пазнакі злучыце ў трохвугольнік. Выражце яго. Складзіце атрыманыя дэталі трохвугольніка добрым бокам адна да адной і сшыйце па кароткім боку.

4 кавалачкі, прызначаныя для кішэняў, скаліце, ад рукі намалюйце кішэню і выражце. Адступіўшы ад пояса 15 см, выкладзіце дэталі кішэняў з абодвух бакоў на добры бок абедзвюх палавінак будучых шараварaў і пракладзіце шво. Пасля гэтага дэталі кішэняў адагніце і зноў праштабнуйце.

Складзіце палавінкі штаноў добрым бокам адна да адной, распраўце кішэні, скаліце і сшыйце па баках. Пасля таго вывернiце выраб і яшчэ раз праштабнуйце вакол кішэняў блізка да краю, а ўверсе і ўнізе прарэзаў зрабіце некалькі змацавальных шыйкаў.

Цяпер злучаныя раней адзін з адным трохвугольнікі ў якасці цвікл трэба ўшыць паміж штанінамі. Размяшчаем дэталь такім чынам, каб самая шырокая яе частка апынулася якраз паміж ног. Сколваем клін спачатку з адной палавінкай штаноў, затым з другой, а потым сшываем.

Застаецца падагнуць і праштабнаваць ніз штанін і ўставіць гумку. Для гэтага сшыйце канцы шырокай эластычнай стужкі, якая адпавядае акружнасці вашай таліі, замкнуўшы ў колца. Пастаўце на ёй 4 пазнакі на аднолькавай адлегласці. Прышпіліце гумку з вываратку да пояса, сумясціўшы пазнакі з цэнтрамі абедзвюх палавінак і бакавымі швамі. Далей, нацягваючы гумку, прышыйце яе на машынцы да пояса. Пасля адагніце гумку ўнутр і зноў праштабнуйце, нацягваючы. Каб стварыць акуратныя зборкі, праштабнуйце гумку трэці раз — па цэнтры.



ВАЗЬМІ МУЖЫКА І ПРЫКУСІ ЯЗЫКА (БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ПРЫМАЎКА).

# УКРАСЦІ, КАБ ПАД'ЕСЦІ

## Што чакае жыхароў Польшчы?

**«Цанавы апакаліпсіс» з-за росту цэн на энергію чакае Польшчу, лічыць польскі вэб-партал Interia са спасылкай на крыніцу з сельскагаспадарчай палаты ў Ніжняй Сілезіі. «Усё стане даражэй, калі так выраслі цэны на электраэнергію, газ, ацяпленне», — заявіў суразмоўнік выдання. Ён адзначыў, што фермеры ў Польшчы скардзяцца на рост кошту энерганосьбітаў. Многія з іх ужо пачалі актыўна скарачаць колькасць сельскагаспадарчых культур, якія вырошчваюцца. Такая сітуацыя можа прывесці да дэфіцыту тавараў на рынку і рэзкага росту цэн на іх. Пры гэтым рэальнай дапамогі ад улады і вытворцам, і спажыўцам чакаць не выпадае. Прагнозы спецыялістаў наконт далейшага развіцця падзей самыя змрочныя. Што ж чакае жыхароў Польшчы?**

### ІНФЛЯЦЫЙНЫ «ПОДЫУМ»

Рост цэн у Польшчы працягвае разгортвацца імклівымі тэмпамі. Паводле інфармацыі Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення, па выніках студзеня індэкс спажывецкіх цэн у Польшчы ў параўнанні з папярэднім годам узляцеў да 17,2 працэнта, што перавышае снежаньскія значэнні, якія складалі 16,6 працэнта. Устойлівае павышэнне ўзроўню спажывецкіх цэн у Польшчы дасягнула ў студзені 2,4 працэнта ў месячным выражэнні. Такі паказчык даў падставу Еўракамісіі паставіць краіну на «еўрапейскі інфляцыйны подыум». Заставацца на ім краіна будзе як мінімум да 2024 года, прыводзіць прагноз ведамства аглядальнік Interia Алан Бартман.

У мінулым месяцы ў краіне зафіксавалі рэкордную за 26 гадоў інфляцыю — 18,4 працэнта. Пра гэта паведаміла радыё RMF24 са спасылкай на даныя Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення краіны. Згодна са статыстычнымі данымі, за год прадукты харчавання і безалкагольныя напіткі падаражэлі на 24 працэнты, затраты на транспарт павялічыліся на 23,7 працэнта, а кошт энерганосьбітаў вырас на 22,7 працэнта.

Адзначаецца, што «рэкардсменам па дарагоўлі» стаў цукар, які за год падаражэў на 85,5 працэнта. Падобная сітуацыя склалася і з палівам, цэны на якое ўзраслі на 53,6 працэнта ў гадавым вылічэнні. У параўнанні з папярэднім месяцам цэны на тавары і паслугі ўзраслі на 1,2 працэнта (у тым ліку паслугі — на 1,6 працэнта і тавары — на 1,1 працэнта).

У той жа час шэраг экспертаў небеспадстаўна лічыць, што Галоўнае статыстычнае ўпраўленне заніжае гэты паказчык. Так, паводле даных фірмы NielsenIQ, сёлета ў студзені спажывецкая інфляцыя склала 19,2 працэнта. Як лічаць спецыялісты, найбольшы рост цэн назіраецца ў супермаркетах, дзе цэннікі «распухлі» сама меней на 22,2—22,8 працэнта. Пры гэтым пакупнікі набылі ў такіх магазінах сёлета менш прадуктаў, чым за аналагічны перыяд мінулага года.

### У КРАЙНЯЙ ГАЛЕЧЫ

Высокая інфляцыя назіраецца ў Польшчы даўно. Як вядома, падчас агульнанацыянальнага даследавання, праведзенага сацыялагічнай кампаніяй Szlachetna Paczka ў другой палове мінулага года, высветлілася, што рост цэн на прадукты харчавання адзначылі 95 працэнтаў палякаў. 89 працэнтаў жыхароў краіны балюча адчулі павелічэнне выдаткаў на ўтрыманне кватэры ці дома. 64 працэнты рэспандэнтаў пачалі эканоміць на культуры, перастаўшы наведваць тэатры, кіно і іншыя ўстановы адпачынку. 58 працэнтаў пачалі менш спажываць электраэнергіі, вады і газу, а 45 працэнтаў — менш купляць харчавання.

Акрамя таго, як аказалася, амаль 2,5 мільёна чалавек у Польшчы жыве ў дамах, дзе цячэ дах, няма герметычных вокнаў і дзвярэй, а на сценах і столях «яўна прысутнічае вільгаць». Кожны дваццаты жыхар краіны не мае ўласных ванны і прыбіральні. Кожная пятая сям'я, у якой ёсць хворыя або інваліды, не ў стане пакрыць усе неабходныя выдаткі на лекі. 1,6 мільёна палякаў, у тым ліку 333 тысячы дзяцей, жывуць ніжэй за пражытачны мінімум, гэта значыць у крайняй галечы.

Сёння ўзровень жыцця ў Польшчы ўпаў да ўзроўню жыцця ў дзевяностыя. Аб гэтым у праекце на YouTube-канале БелТА распавёў польскі палітолаг Матэвуш Піскорскі. «Гэтая зіма для палякаў аказалася няпростай. Пэўнай частцы польскага грамадства вельмі цяжка. Інфляцыя працягвала расці, кошт прадуктаў першай неабходнасці таксама ўзрос», — расказаў Матэвуш Піскорскі. Па словах польскага палітолага, цяпер эканамічная сітуацыя ў краіне нават горшая, чым у часы крызісу, выкліканага пандэміяй, а спробы польскага кіраўніцтва справіцца з праблемамі не прыносяць чаканага выніку.



### ХВАЛЯ ЗЛАЧЫНСТВАЎ

Былы прэзідэнт Польшчы Лех Валенса паскардзіўся на імклівае збядненне. Як піша Super Express, прычынай гэтага стаў значны рост цэн, які назіраецца ў краіне. Па словах польскага экс-лідара, яго пенсія на працягу некалькіх гадоў застаецца нязменнай, паколькі ўсе індэксацыі, якія праводзяцца, «праходзяць міма яго». «Прадукты цяпер дарагія, таму мае порцыі на сняданак, абед і вячэру скарачаюцца», — распавёў Валенса, адзначыўшы, што вельмі незадаволены такім станам спраў. Як заявіў экс-прэзідэнт, яго пенсія складае каля 11-13 тысяч злотых. Валенса лічыць такія грошы недастатковымі, паколькі высокая інфляцыя ў Польшчы іх заўважна «з'ядае». Былы польскі лідар дадаў, што якая цяпер улада, такая і сітуацыя ў краіне.

Што ўжо казаць пра іншых польскіх пенсіянераў, якія атрымліваюць заўважна менш (мінімальная пенсія складае каля 1300 злотых). Збядненне заканамерна вядзе да росту ўзроўню злачыннасці. Нядаўна выданне Rzeczpospolita паведаміла, што за год колькасць крамных крадзяжоў у краіне ўзрасла амаль на траціну (на 31,1 працэнта) — іх было зарэгістравана больш за 32,7 тысячы. Колькасць розных правапарушэнняў, так ці інакш звязаных з крадзяжамі ў крамах, павялічылася на 21,5 працэнта і склала 234,3 тысячы выпадкаў. «Рост колькасці крадзяжоў — выразны сігнал аб наяўнасці праблем на рынку. З-за росту цэн на здзяйсненне такіх злачынстваў рашаецца ўсё больш людзей. Для крам гэта, вядома ж, велізарная праблема, якая азначае павелічэнне выдаткаў на ажыццяўленне сваёй дзейнасці», — заўважае кіраўнік польскай Арганізацыі гандлю і збыту Рэната Юшкевіч.

Эксперты адзначаюць, што новай з'явай сталі рэгулярныя крадзяжы самых танных прадуктаў, якія раней масавым попытам у крамных злодзеяў не карысталіся. «Крадзяжамі з крам у асноўным займаюцца людзі, якія робяць тое ў некаторым сэнсе вымушана», — тлумачыць дырэктар польскага дыстрыб'ютара дзіцячых брэндаў SkipWish Мацей Тыгельскі.

Колькасць крадзяжоў з супермаркетаў летась павялічылася на 20,8 працэнта і склала 188,3 тысячы. Але яшчэ хутчэй (на 24,6 працэнта) узрасла колькасць крадзяжоў у невялікіх крамах: іх зарэгістравана звыш 46 тысяч. Работнікі гандлёвых пунктаў прызнаюць, што інфармуюць не аб усіх выпадках крадзяжоў. «Усё часцей прадукты людзі проста з'ядаюць у краме, што ў выніку адбіваецца на ўсіх кліентах, таму што з-за затрат даводзіцца ўзнімаць цэны», — паведамілі прадаўцы.




### ЕЖА СА СМЕТНІЦЫ

Нізкі рост ВУП спрагназаваў для Польшчы Нацыянальны банк краіны, паведаміў TVN. Пры гэтым, як скардзяцца палякі, інфляцыйная крывая абсалютна непрадказальная. У сакавіку Нацбанк апублікаваў новы інфляцыйны прагноз. Згодна з ім, сёлета можна «з 50-працэнтнай верагоднасцю» чакаць гадавой дынамікі цэн у дыяпазоне 10,2-13,5 працэнта, 3,9-7,5 працэнта — у 2024 годзе і 2—5 працэнта — у 2025-м. Гэта азначае, што да інфляцыйнай мэты, якую раней абвясціў Нацыянальны банк Польшчы (2,5 працэнта), краіна наблізіцца толькі праз два гады.

СМІ пастаянна размяшчаюць парады аб тым, як і дзе можна сэканоміць. У крамах «варта зазірнуць у скрыні і халадзільнікі з прадуктамі, тэрмін прыдатнасці якіх заканчваецца. Гэта, як правіла, паўнавартасная ежа па значна ніжэйшых цэнах. Купляйце адзенне, якое было ва ўжытку, мэблю, аксесуары для дому, кнігі, дзіцячыя цацкі, настольныя гульні, галаваломкі, бо гэта вялізная эканомія», — раіць партал Onet.pl.

Яскравым сведчаннем сацыяльнага крызісу стала, як піша Gazeta Wyborcza, распаўсюджванне ў Польшчы такой з'явы, як фрыганізм — «выратаванне» ежы са смеццевых кантэйнераў. Паміж сабой фрыганы трымаюць сувязь праз сацсеткі. Толькі ў Лодзі іх налічваецца звыш 6 тысяч чалавек. «Нягледзячы на тое, што людзі пачынаюць галадаць, маркеты працягваюць выкідваць сотні тон непрададзеных прадуктаў, — адзначае Gazeta Wyborcza. — Паводле даследавання, праведзенага ў рамках праграмы рацыяналізацыі і скарачэння харчовых адходаў, крамы штогод выкідваюць 337 тысяч тон ежы».

Каля паловы жыхароў Польшчы апасаецца страціць работу.

Як паведаміў польскі партал Wprost, узровень беспрацоўя ў краіне зноў вырас, што адбіваецца на настроі людзей. Эканамічны спад, інфляцыя і высокія працэнтныя стаўкі паўплывалі на рынак працы ў Польшчы. Беспрацоўе расце ўжо каторы месяц запар. Як паведаміла Міністэрства сям'і і сацыяльнай палітыкі Польшчы, у канцы студзеня ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя склаў 5,5 працэнта супраць 5,2 працэнта месяцам раней. Колькасць зарэгістраваных беспрацоўных на канец студзеня склала больш за 850 тысяч чалавек.

Згодна са справаздачай «Рынак працы, адукацыя, кампетэнцыі. Бягучыя тэндэнцыі і вынікі даследаванняў», падрыхтаванай па запыце Польскага агенцтва развіцця прадпрымальніцтва, страх страціць крыніцы даходу ёсць у 42 працэнтаў рэспандэнтаў. Між тым, у студзені мінулага года беспрацоўя апасаліся толькі 22 працэнты апытаных. На думку сацыёлагаў, турбуючыся аб захаванні работы, людзі з меншай верагоднасцю будуць настойваць на павышэнні заробку. У студзені 2022 года на прыбаўку разлічвалі 54,5 працэнта палякаў, у лістападзе яе чакалі ўжо толькі 35 працэнтаў, а 32 працэнты апытаных заявілі, што хочуць уладкавацца на падпрацоўку.

### ШЛЯХ ДА БАНКРУЦТВА

Тым часам стала вядома, што польскія ўлады збіраюцца выдаткаваць на абарону 4 працэнты ВУП дзяржавы, што ўдвая перавышае стандарт Паўночнаатлантычнага альянсу. У разліку на душу насельніцтва краіна будзе ўкладваць у войска больш за астатніх у НАТА. Паводле інфармацыі The Telegraph, Польшча заказала 1 тысячу паўднёвакарэйскіх K2 і 250 новых танкаў Abrams з ЗША. Дзякуючы гэтаму, краіна можа перасягнуць па колькасці танкаў Брытанію, у якой у распараджэнні 227 бронемашын. Палякі плануюць закупіць каля сотні верталётаў Apache у Вашынгтона, а ў Сеула — 48 самалётаў FA-50. Польшча ўзмоцніць артылерыю 600 гаўбіцамі K9, 18 рэактыўнымі сістэмамі залпавага агню HIMARS і 288 сістэмамі MRL K239 Chunmoo з Паўднёвай Карэі. Акрамя таго, паводле некаторых звестак, суседняя краіна папрасіла паўднёвакарэйскую кампанію пабудаваць завод па вытворчасці боепрыпасаў для танкаў і гаўбіц. Таксама ідуць перагаворы аб будаўніцтве «буйнога зброевага прадпрыемства» ў супрацоўніцтве з Вялікабрытаніяй. Паскорыўся працэс падпісання мноства новых вайсковых кантрактаў. Колькасць польскага войска маюць намер падвоіць да 300 тысяч чалавек. Цяпер разам з добраахвотнікамі і студэнтамі ваенных устаноў узброеныя сілы Польшчы налічваюць 164 тысячы чалавек.

«У нас ужо наступіў дэмаграфічны крызіс: за дзесяцігоддзе колькасць палякаў скарацілася амаль на два мільёны чалавек. Можна крыху змяніць траекторыю гэтага небяспечнага метэарыта, але ён абавязкова стукне па нас», — заявіў Rzeczpospolita прэзідэнт Інстытута дзяржаўных фінансаў Славамір Дудэк. Эксперт падкрэсліў, што насельніцтва краіны старэе вельмі хутка. Гэта стварыць вялікую нагрузку на эканоміку і прывядзе ў 2050-м да некантраляванага росту дзяржаўнага доўгу Польшчы з цяперашніх 55 да 140 працэнтаў ВУП.

На сённяшні дзень сітуацыя складваецца такім чынам, што Польшча паступова набліжаецца да немінучага банкруцтва. Прычынай гэтага, як піша Interia са спасылкай на польскіх экспертаў, стала спіраль папулізму, якую раскруціла Варшава. «Інфляцыя прыводзіць да росту сацыяльнай базы папулізму, — пракаментаваў сітуацыю эканаміст Ежы Хаўзер. — Алгарытм такі: інфляцыя, беднасць, расчараванне, прэтэнзія, індэксацыя і, як вынік, яшчэ больш высокая інфляцыя».

**Пётр ДУНЬКО.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Будкова К.В. извещает о проведении 7 апреля 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 65 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

**ПОЛНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА в количестве 69 лотов (№№ лотов 2, 3, 4, 5, 10, 11, 15–17, 21, 23, 24–65, 67, 69–73, 75–84) размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.09.2022 г. № 188 (29810)**

**Продавец:** открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», 247210, г. Жлобин, Гомельская область, ул. Школьная, 8.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 303-53-09, Григорович Павел Карлович.**

**Шаг аукционных торгов** – 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в российских рублях (RUB) – ПАО Сбербанк г. Москва, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, ИНН 7707083893, к/с 30111810800000000154, БИК BLBBBY2X, ОАО «Белинвестбанк», УНП 807000028, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с **23 марта 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 5 апреля 2023 г. в 16.00 включительно.**

**Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

Проводится аукцион в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 341-15-45, 8 (044) 599-18-16.**

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **Добрушское районное потребительское общество** (УНП 400005661) 247070, Гомельская обл., Добрушский р-н, г. п. Тереховка, ул. Вокзальная, 47, тел. (02333) 2-30-46, в лице ликвидатора Беланова Р.Н.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **07 апреля 2023 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 311/С-50225, общ. пл. 176 кв. м, наименование – магазин № 11, составные части и принадлежности – одноэтажное блочное облицованное кирпичом с кирпичной пристройкой здание магазина с надворными постройками: сараем, расположенное на земельном участке с кадастровым № 321287202102000088, пл. 0,079 га, по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Утесовский с/с, п. Степь (магазин) | 6 900,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 311/С-52032, общ. пл. 152,9 кв. м, наименование – магазин № 8, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное с кирпичной пристройкой здание магазина, с надворными постройками: сараем, расположенное на земельном участке с кадастровым № 321280801601000033, пл. 0,0858 га, по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Тереховский с/с, п. Красный Алес | 2 050,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. № 311/С-52020, общ. пл. 175,2 кв. м, наименование – магазин № 7, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное с кирпичной пристройкой и крыльцом здание магазина, с надворными постройками: сараем, расположенное на земельном участке с кадастровым № 321286403101000233, пл. 0,0197 га, по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Перекростовский с/с, аг. Перерост, пер. Центральный, 6 | 7 950,00 |
